

РОЗНЫЯ БРЭНДЫ — АДНА СТРАТЭГІЯ 4

ШТО ВЯДОМА ПРА НОВЫ ШТАМ «АМІКРОН» 8



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

1 СНЕЖНЯ 2021 г. СЕРАДА № 232 (29601)

## ЛІЧБА ДНЯ

**18,3 млрд долараў**

*склаў знешні дзяржаўны доўг па стане на 1 лістапада 2021 года, зменшыўшыся з пачатку года на $0,3 млрд (з улікам курсавых розніц), або на 1,6 %, паведаміла Міністэрства фінансаў. У студзені—кастрычніку 2021 года прыцягнуты знешнія дзяржаўныя пазыкі на суму, эквівалентную $1 065,5 млн, у тым ліку $857,1 млн — урада Расіі, $163,5 млн — МБРР, $20 млн — Фонду міжнароднага развіцця АПЕК, $14,9 млн — Экспартна-імпартнага банка Кітая, $10 млн — ЕБРР і СІБ. Пагашэнне знешняга дзяржаўнага доўгу ў студзені-кастрычніку склала $1 451,1 млн, з якіх $638,8 млн — урада і банкаў Расіі, $406,9 млн — банкаў Кітая, $276,6 млн — ЕФСР, $121,6 млн — МБРР, $6,5 млн — ЕБРР і ПІБ, $0,7 млн — Таварна-крэдытнай карпарацыі ЗША. Дзяржаўны доўг Беларусі на 1 лістапада склаў Br55,3 млрд і зменшыўся ў параўнанні з пачаткам года на Br2,5 млрд, або на 4,3 %.*



## КОРАТКА

- Праект «Мінск — здаровы горад» дапоўніцца постковідным аздараўленнем.
- У Беларусі скарачаецца колькасць малазабяспечаных сем'яў.
- Школьнік рэалізоўвае ў БДУ экалагічны праект па перапрацоўцы адходаў лясной прамысловасці.
- Натарыусы і адвакаты Мінскай вобласці 2 снежня пракансультуюць бясплатна.

# Самы зімовы сюжэт





Сталічнае прадпрыемства «Мінскрэклама» па традыцыі да першага зімовага месяца ўпрыгожвае горад навагоднімі ёлкамі. Вось і сёлета спецыялісты механазборачных работ фірмы ўжо паспелі ўсталяваць і аздобіць шмат зялёных (хай сабе і штучных) прыгажунь: каля Палаца спорту і Нацыянальнай бібліятэкі, на плошчы Незалежнасці і каля Лядовага палаца, у Лошыцкім парку і каля філармоніі, а таксама на іншых пляцоўках. Адзін з удзельнікаў падрыхтоўкі горада да свята — Павел ПЕТУХОЎ. Трэці год ён працуе ў «Мінскрэкламе» і ў пераднавагодні сезон разам з брыгадай афарміцеляў прыбірае карункамі і шарамі наш спрадвечны сімвал. Сёлета Паўлу выпаў гонар усталёўваць і ўпрыгожваць галоўную ёлку сталіцы на Кастрычніцкай плошчы — каля Палаца Рэспублікі. Па некалькі разоў на дзень пры дапамозе аўтавышкі спецыяліст падымаецца на вышыню і надзейна мацуе люстраныя рознакаляровыя шары. І з кожным пад'ёмам зялёная прыгажуня ўсё больш набывае свой адметны вобраз і непаўторнасць.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара**

Парламенцкі дзённік

## ШКОЛЬНЫЯ АБЕДЫ СУПРАЦЬ ФАСТ-ФУДУ

### Пра што сёння варта задумацца арганізатарам харчавання



**Сучасныя дзеці вельмі пераборлівыя ў ежы. З такой праблемай сутыкаюцца многія сем'і. А як накарміць, напрыклад, тысячу альбо дзве тысячы дзяцей? Пры гэтым усе неабходныя нормы захаваць і задаволіць жаданні школьнікаў. А галоўнае, не страціць пазіцыі падчас тальнага наступлення фаст-фуду. Карэспандэнт «Звязды» адправілася ў сумесны рэйд з дэпутатам і спецыялістам у сферы дзяржкантролю ў сталовую гродзенскай школы.**

СТАР. 4

Перспектыва

## ІНДУСТРЫЯ СУСТРЭЧ

### Беларусь гатова развіваць MICE-турызм

**Пандэмія значна паўплывала на турызм, паспрыяла новым гібрыдным формам зносін. Так, адначасова з жывымі сустрэчамі можа ісці кантактаванне праз інтэрнэт. Але чым больш стасункаў праходзіць у анлайн-фармаце, тым больш нарастае патрэба ў жывых зносінах. І дзелавы турызм таму не выключэнне. Апошнім часам усё часцей выкарыстоўваецца тэрмін MICE-турызм (гэта абрэвіятура ад англійскіх слоў Meetings — карпаратыўныя сустрэчы, Incentives — тымбілдынгі і матывацыйныя туры для супрацоўнікаў, Conferences — з'езды, семінары, канферэнцыі, Exhibitions — выстаўкі, нефармальныя сустрэчы).**

СТАР. 7



ISSN 1990 — 763X

**Кожны дзень – са «Звяздой»!**

**Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2022 года, — у падарунак чатыры календары — маляўнічы насценны, рэлігійны, народны і месяцавы**

З першых вуснаў

# «Я ПАВІНЕН ПРАДБАЧЫЦЬ, ШТО АДБУДЗЕЦЦА, КАБ НЕ АТРЫМАЛАСЯ, ЯК У 41-м ГОДЗЕ»

## Прэзідэнт даў інтэрв'ю гендырэктару МІА «Россия сегодня» Дзмітрыю Кісялёву

**Шраг размоў Аляксандра Лукашэнкі з прадстаўнікамі замежных сродкаў масавай інфармацыі працягваецца. Сустрэча з кіраўніком найбуйнейшага расійскага медыяхолдынга Дзмітрыем Кісялёвым — чацвёртае інтэрв'ю Прэзідэнта за месяц для небеларускіх медыя. Да гэтага кіраўнік краіны адказаў на пытанні амерыканскай тэлекампаніі CNN, брытанскай карпарацыі BBC, расійскага часопіса «Национальная оборона».**

Па звычайным парадку такіх размоў іх поўны змест становіцца вядомы аўдыторыі пасля публікацыі ў СМІ, якому давалася інтэрв'ю. Але некаторыя фрагменты з размовы былі прадстаўлены для апублікавання ўжо ўчора. Так, напрыклад, журналіст запытаў: калі Германія адмовіцца ад прысутнасці ядзернай зброі на сваёй тэрыторыі, яе, верагодна, размесцяць у Польшчы. Як тады павядзе сябе Беларусь?

«Тады я прапаную Пуціну вярнуць ядзерную зброю ў Беларусь», — сказаў Прэзідэнт.

«Якую ядзерную зброю?» — удакладніў Дзмітрый Кісялёў.

«Мы дамовімся, якую. Тую ядзерную зброю, якая будзе найбольш эфектыўная пры такім суадкрананні. Мы на тэрыторыі Беларусі да гэтага гатовыя. Я, як руплівы гаспадар, нічога не разбурыў. Усе «хлявы» (для размяшчэння гэтай зброі. — «Зв.») стаяць на месцы», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Таксама Аляксандр Лукашэнка расказаў пра планы рэагавання на спробы стварыць канфлікт на граніцы.

«Яны пачалі манеўры ў Польшчы, Латвіі, Літве і Украіне. Што павінен я рабіць як галоўнакамандуючы: не ісці на правакацыі. Але я павінен прадбачыць, што адбудзецца, каб не атрымалася, як у 41-м годзе», — сцвярджае Прэзідэнт, прывёўшы ў прыклад паводзіны кіраўніцтва СССР напярэдадні пачатку Вялікай Айчыннай вайны.

«Таму я вымушаны мець планы і падраздзяленні беларускай арміі, якія будуць рэагаваць на любую спробу стварыць канфлікт на граніцы Прыбалтыкі, Польшчы і Украіны. На жаль, украінцы, як звычайна, пабеглі наперадзе нават войскаў НАТА», — дадаў кіраўнік краіны.

Адказваючы на пытанні Дзмітрыя Кісялёва, закрануў Прэзідэнт і стаўленне Захаду да сітуацыі з мігрантамі. Па яго словах, калі еўрапейцы скасавалі дагавор аб рэадмісіі, ён заявіў, што больш не будзе абараняць іх граніцы.

«Яны скасавалі першымі і не хочуць абмяркоўваць зараз гэту тэму. Калі мы з Прэзідэнтам Пуціным аб вытоках гаварылі, я яму сказаў, адкуль усё пачалося — санкцыі. Слухай, на шыі накінулі пятлю, зацiскаюць і кажуць: «Абараняй мяне!» Я шчыра ім заявіў у самым пачатку: «Вы пайшлі на абвастрэнне адносін, абвінавачваеце нас у гэтым самалёце (пасадка рэйса Ryanair. — «Зв.») і іншае, хоць ніводнага факта няма. Вы пачалі ўдушэнне Беларусі», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Закрануўшы тэму бежанцаў на граніцы, кіраўнік дзяржавы нагадаў, што калі гаварыў па тэлефоне з в.а. канцлера Германіі Ангелай Меркель, яна папрасіла яго заняцца рэпатрыяцыяй гэтых людзей. «Я кажу: ведаеце, Ангела, такімі жорсткімі словамі давайце не будзем нават гаварыць, — расказаў Прэзідэнт. — Гэта значыць, хапай адсюль і вывозь сілай. Я ёй адразу сказаў, у канцы ўжо, двойчы паўтарыў: я буду старацца вырашыць гэту праблему да Новага года, таму што яна нам не патрэбна. Людзі боўтаюцца то ў Мінску, у Гродне і іншае. Ведаеце, як рэагуе насельніцтва. Мы будзем прасіць гэтых людзей, якія законна ў нас знаходзяцца па турыстычнай візе ў гасцініцы і іншае, каб яны вярнуліся назад, таму што гуманітарнага калідора не будзе».

Прэзідэнт адзначыў, што эвакуацыйныя рэйсы былі аплачаны Іракам. Беларусь жа ўжо затраціла на ўтрыманне бежанцаў, паводле даных толькі тыднёвай даўнасці, $12,5 млн. «Цяпер гэта будзе ў два разы больш», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

«Гэта значыць увесь дагляд, харчаванне, абаграванне, лячэнне...», — удакладніў Дзмітрый Кісялёў.

«Абсалютна», — пацвердзіў Прэзідэнт.

* * *

Пасля размовы Дзмітрый Кісялёў падзяліўся з беларускімі калегамі сваімі ўражаннямі ад сустрэчы. Ён адзначыў шчырасць, прыхільнасць Аляксандра Лукашэнкі да абмеркавання.

«Ён не лімітаваў мяне ў часе. Мы размаўлялі каля дзвюх з паловай гадзін. Размова была напружаная. Яна складалася з пяці блокаў, там была належная драматургія. У мяне ёсць адчуванне добра зробленай работы, нашай агульнай работы, бо інтэрв'ю — гэта заўсёды агульная работа», — сказаў кіраўнік МІА «Россия сегодня».

Інтэрв'юер паведаміў, што Прэзідэнт паглыбляўся ў гісторыю, гаварыў пра будучыню, шмат было навін пра асабістыя сустрэчы з Уладзімірам Пуціным. Дзмітрый Кісялёў адзначыў, што ішоў на рызыку і задаваў пытанні, якія маглі выклікаць нейкае раздражненне ў кіраўніка краіны, але Прэзідэнт адказваў добразычліва.

«Гэта інтэрв'ю, як мне здаецца, дае падставу для таго, каб глыбей зразумець логіку дзеянняў Прэзідэнта і логіку беларускага народа, калі ён падтрымлівае яго», — дадаў журналіст.

Па яго словах, гэта размова стала для яго адкрыццём, бо раней Дзмітрый Кісялёў ніколі не сустракаўся з Аляксандрам Лукашэнкам. Як падкрэсліў журналіст, асабліва ўразіла яго рашучасць Прэзідэнта Беларусі, з якой ён гатовы адстойваць створаную ім дзяржаву, і бескампраміснасць, з якой ахоўвае нацыянальныя інтарэсы.

Інтэрв'ю будзе апублікавана на рэсурсе РІА «Новости» агенцтва «Россия сегодня». Поўнасцю размову, як расказаў Дзмітрый Кісялёў, па дамоўленасці пакажуць на канале «Россия 24». Фрагмент інтэрв'ю пакажуць у найбліжэйшым выпуску «Вестей недели» на канале «Россия». Але і гэта не ўсе рэсурсы, якія будуць асвятляць размову.

«Інтэрв'ю будзе размешчана на РІА «Новости». Гэта самы папулярны інфармацыйны рэсурс у рускім інтэрнэце. У нас больш за шэсць мільёнаў заходаў у дзень. «Россия сегодня» працуе на 32 мовах. Тобок гэта інтэрв'ю пойдзе на 32 мовах. Плюс мы чэмпіёны па рабоце ў сацыяльных сетках. У нас каля 10 мільёнаў падпісчыкаў. У нас ёсць радыё «Спутник» — самая цытаваная радыёстанцыя Расіі. На ўсіх нашых рэсурсах будзе выкарыстана гэта інтэрв'ю. Увогуле, мала не падасца», — падсумаваў Дзмітрый Кісялёў.

Міжнароднае інфармацыйнае агенцтва «Россия сегодня» асвятляе за мяжой падзеі палітычнага, грамадскага жыцця ў Расіі і падзеі ў свеце. Медыяхолдынг уключае ў сябе радыё, навінавыя стужкі, інфармацыйныя парталы, мультымедыйныя прэс-цэнтры, вытворчасць і распаўсюджванне фотакантэнту, інфаграфікі, інфармпляцоўкі ў сацыяльных сетках і вытворчасць кантэнту для мабільных праграм. Штодня «Россия сегодня» выпускае каля пяці тысяч інфармацыйных матэрыялаў. Карэспандэнцкая сетка медыя налічвае дзясяткі журналістаў у Расіі і звыш 100 па ўсім свеце.

**Марыя ДАДАЛКА.**

---

Акцэнты

**Наталля КАЧАНАВА**:

# «Наш абавязак — захаваць суверэнную і незалежную Беларусь, мір і спакой у нашай краіне»

**Спікер верхняй палаты парламента на чарговай сесіі Савета Рэспублікі заклікала сенатараў данесці праўду на ўсіх магчымых пляцоўках.**

Наталля Качанава акцэнтавала ўвагу, што сітуацыя, якая разгортваецца вакол Беларусі, не можа не хваляваць, бо на краіну працягваецца масіраваны гібрыдны ціск. Спікер падкрэсліла: метады атакі становяцца ўсё больш цынічныя і антыгуманныя, выходзяць за межы здаровага сэнсу і чалавечай маралі:

— Спачатку нашу дзяржаўнасць спрабавалі знішчыць бліцкрыгам, калі не атрымалася — пачалі душыць санкцыямі, — нагадала Наталля Качанава і працягнула, што ў адрас Беларусі, беларускіх улад і беларускага народа не спыняецца плынь фальшу і хлусні. — Нашым прадстаўнікам ствараюцца ўсялякія перашкоды ў давядзенні свету праўды: блакіруецца ўдзел у міжнародных мерапрыемствах, а еўрапейскім журналістам забараняецца мець зносіны з намі.

Яна акцэнтавала, што заходнія «лялечнікі» апусціліся да выкарыстання ў якасці гібрыднай зброі ні ў чым не вінаватых людзей:

— Неймаверна, што ў XXI стагоддзі бежанцаў не толькі выштурхваюць да нас сілай, ужываюць супраць іх слёзатачывы газ, святлошумавыя гранаты, ядахімікаты, але і не грэбуюць у прамым сэнсе падкідваннем іх мёртвых змардаваных цел на беларускую тэрыторыю, — абураецца Старшыня Савета Рэспублікі.

Яна перакананая: заходнія палітыкі баяцца паказаць сваму народу праўду — «дэмакратыя», што дзесяцігоддзямі навязвалася,



не спраўляецца з надзённымі праблемамі, няхай гэта пандэмія або прыток мігрантаў. Уласныя слабасці і памылкі яны спрабуюць закамуфляваць пад нібыта больш значныя праблемы іншых краін і народаў.

Спікер адзначае, што міграцыйная сітуацыя на беларуска-польскай граніцы паказала: чалавечае жыццё для заходніх дэмакратаў нічога не значыць.

— Ім не шкада ні цяжарных жанчын, ні дзяцей, ні старых, якія, паддаўшыся на іх жа абяцанні, адправіліся ў Еўрасаюз па лепшае жыццё, а цяпер ужо трэці тыдзень вымушаныя знаходзіцца ў поўнай нявызначанасці, — падкрэсліла яна.

Спікер верхняй палаты парламента адзначыла, што, на шчасце гэтых людзей, у якасці транзітнай тэрыторыі яны выбралі менавіта Беларусь:

— Для нас, беларусаў, няма чужога болю — і мы не пакінулі бежанцаў у бядзе. Усе дзяржаўныя органы, грамадскія арганізацыі і проста грамадзяне адгукнуліся і дапамагаюць бежанцам, — кажа Наталля Качанава.

Яна нагадала, што ў ліку першых, хто прапанаваў сваю дапамогу і аказаў садзейнічанне, быў Савет Рэспублікі. Па даручэнні кіраўніка дзяржавы сенатары ажыццяўляюць агульнае каардынаванне гуманітарнай місіяй на граніцы. Асаблівая ўвага — цяжарным жанчынам і дзецям.

Трэба сказаць, што з самага першага дня ўтварэння стыхійнага лагера і да сённяшняга старшыня Пастаяннай камісіі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Віктар Лісковіч знаходзіцца на граніцы для рэалізацыі даручэння на месцы. Многія сенатары таксама непасрэдна далучаныя да вырашэння дадзенага пытання.

Наталля Качанава нагадала, што Прэзідыум Савета Рэспублікі адразу ж звярнуўся да міжнароднай супольнасці з заклікам не заставацца абыякавымі і прыкласці намаганні для ўрэгулявання сітуацыі ў канструктыўным ключы.

Са свайго боку, пярвічная арганізацыя Беларускага саюза жанчын верхняй палаты парламента правяла круглы стол з удзелам прадстаўніц «пярвічак» краіны, дзе таксама быў прыняты зварот.

Акрамя таго, у рамках мерапрыемстваў Міжпарламенцкай асамблеі дзяржаў — удзельніц СНД сенатары выступілі з заявай аб міграцыйнай сітуацыі на беларуска-польскай граніцы, дзе прагучаў заклік да краін — удзельніц Садружнасці аб'яднаць намаганні ў супрацьстаянні гэтаму выкліку.

Спікер верхняй палаты парламента акцэнтавала ўвагу на тым, што дэлегацыя Германіі ініцыіравала ўключэнне ў праект Парадку дня 143-й Асамблеі Міжпарламенцкага саюза ў Мадрыдзе надзвычайнага пункта на тэму «Спыненне гандлю людзьмі, спыненне парушэнняў правоў чалавека і работа ў напрамку да свабодных і сумленных выбараў у Беларусі».

Наталля Качанава паведаміла прысутным, што Савет Рэспублікі распачаў усе магчымыя меры па недапушчэнні разгляду такога пытання ў ходзе Асамблеі, і падзякавала намесніку Старшыні Савета Федэрацыі, каардынатару геапалітычнай групы «Еўразія» Канстанціну Касачову за падтрымку Беларусі і крокі па супрацьдзеянні прыняцця рэзалюцыі.

Таксама сенатары звярнуліся да старшыні Міжпарламенцкага саюза з патрабаваннем распачаць дзейсныя і неадкладныя меры па недапушчэнні ўключэння гэтага пункта ў Парадак дня і сумесна з Міністэрствам замежных спраў пераканалі дружалюбныя Беларусі дзяржавы падтрымаць нашу краіну.

— Мы не можам маўчаць! Наша галоўная зброя ў гэтым вар'яцтве — наша праўда. І мы павінны данесці яе свету, — перакананa Наталля Качанава. Яна заклікала ўсіх і надалей займаць актыўную і адказную пазіцыю. — Выступайце ў сродках масавай інфармацыі — рэспубліканскіх і мясцовых, сустракайцеся з працоўнымі калектывамі і насельніцтвам па месцы жыхарства.

Спікер нацэльвае сенатараў данесці праўду ў ходзе працоўнай і грамадскай дзейнасці — на форумах, канферэнцыях, круглых сталах, дыялогавых пляцоўках:

— Выкарыстоўвайце і шукайце для гэтай дзейнасці любую магчымасць! Наш абавязак — захаваць суверэнную і незалежную Беларусь, мір і спакой у нашай краіне, — падкрэсліла яна.

**Вольга АНУФРЫЕВА, фота БелТА.**

Кантэкст

# ЧАКАННЕ ДАЛЬНАБОЙШЧЫКАЎ

## На граніцы сабраліся тысячы фур

**Як вядома, пандэмія каранавіруса запаволіла рух тавараў і паслуг па ўсім свеце. Здараюцца ў сусветнай лагістыцы і надзвычайныя здарэнні — накшталт затору ў Суэцкім канале. Усё гэта аб'ектыўныя цяжкасці, да якіх вытворцы і перавозчыкі ставяцца з разуменнем. Вядома, пры гэтым страт не пазбегнуць, але што тут паробіш.**

Іншая справа, калі бар'еры ствараюцца штучна, праз дзеянні асобных краін. У прыватнасці, непераадольная і крыўдная для вытворцаў і перавозчыкаў перашкода ўзнікла для транспарту, які перамяшчаецца праз беларускую граніцу. І гаворка тут ідзе пра тысячы вялікагрузаў, не кажучы пра іншы транспарт, і інтарэсы дзясяткаў краін.

Сітуацыя набывае крытычныя абрысы. Больш за 4,5 тысячы вялікагрузных аўтамабіляў сабралася на граніцы ў беларускіх пунктах пропуску, чакаючы выезду ў Латвію, Літву і Польшчу. Такія даныя апублікаваў учора Дзяржаўны пагранічны камітэт у сваім тэлеграм-канале.

«Колькасць грузавікоў, якія чакаюць уезду ў ЕС перад беларускімі пунктамі пропуску, прадаўжае расці. За мінулыя суткі толькі два з дзевяці еўрапейскія пункты пропуску на граніцы з Беларуссю выканалі дамоўленасці па афармленні грузавога транспарту», — адзначылі ў пагранкамітэце.

Па даных ведамства, найбольш загружаным застаецца літоўскі напрамак. Сваёй чаргі выехаць у Літву чакалі 2450 фур. Як растлумачылі ў ДПК, напрыклад, праз пункт пропуску «Мядзінінкай» (з беларускага боку — «Каменны Лог») у ЕС прайшло ўсяго 249 фур, што ўдвая менш прапускной здольнасці гэтага пагранпераходу. Таксама ўчора стала вядома, што літоўскі бок часова не афармляе транспарт у «Мядзінінкаі». Аб гэтым БелТА паведамілі ў Гродзенскай рэгіянальнай мытні. «Сумежным бокам часова не ажыццяўляецца афармленне транспартных сродкаў з-за адсутнасці інтэрнэту», — распавялі ў мытні.

«Нягледзячы на тое, што праз латвійскія пагранпераходы за мінулыя суткі транспарт уязджаў у ЕС без затрымак, на гэтым напрамку захоўваецца вялікая колькасць фур», — адзначылі ў Дзяржпагранкамітэце. Там удакладнілі, што ў чэргах на выезд у Латвію стаяла 906 вялікагрузаў.

У пунктах пропуску на польскім напрамку сабралася 1200 грузавікоў. У ДПК нагадалі, што ў сувязі з закрыццём пункта «Кузня Беластоцкая» польскі бок істотна знізіў прапускную здольнасць на ўсім напрамку.

У Дзяржпагранкамітэце ўдакладнілі, што беларускі бок афармляе грузавы транспарт без затрымак, аб чым сведчыць адсутнасць чэргаў на ўезд у Беларусь. «Прымаюцца ўсе неабходныя меры, накіраваныя на выкананне норм па пропуску транспартных сродкаў у двухбаковым пагадненні. У прыватнасці, за апошнія суткі ў пункце пропуску «Казловічы» на ўезд прынята больш за 1100 транспартных сродкаў. У Польшчу ж іх колькасць паменшылася на 20 працэнтаў», — паведаміў тэлеканалу СТБ першы намеснік начальніка Брэсцкай мытні Аляксандр Вайцяхоўскі.

Колькасць грузавога транспарту, які чакае ўезду ў краіны ЕС, павялічылася на 30 працэнтаў. Такія даныя паведамілі ў Дзяржаўным пагранічным камітэце, калі параўналі лічбы на пачатак гэтага і мінулага тыдняў. У чым жа прычына?

«Нежаданне сумежных краін ЕС у поўным аб'ёме выконваць дамоўленасці па пропуску грузавікоў з'яўляецца асноўнай прычынай вялікай колькасці транспарту перад беларускімі пунктамі пропуску», — падкрэсліў у ДПК. Як адзначылі ў ведамстве, кантрольныя службы двух польскіх пагранпераходаў, якія функцыянуюць, выканалі дамоўленасці па пропуску фур толькі на 70 працэнтаў. Акрамя таго, закрыццё пагранперахода «Кузніца Беластоцкая» прывяло не толькі да істотнага зніжэння прапускной здольнасці, але і да павелічэння нагрузкі на суседніх альтэрнатыўных маршрутах у ЕС. «Беларускі бок (пункт пропуску «Брузгі») гатовы ў любы момант пачаць афармленне асоб і транспарту. Аб гэтым паведамілі Польшчы яшчэ 19 лістапада», — канстатавалі ў Дзяржпагранкамітэце.

Стала вядома, што раней расійскі Кансультатыўны савет па замежных інвестыцыях (у яго ўваходзяць такія кангламераты, як Danone, Mars, Metro, PepsiCo, Sanofi, Coca-Cola, Unilever і іншыя) папрасіў першага віцэ-прэм'ера РФ Андрэя Белавусава дапамагчы ў вырашэнні праблем з транзітам грузаў праз Беларусь. Далейшы прастой фур (дзень прастою адной машыны абыходзіцца мінімум у €500) або змяненне маршрутаў руху пагражае таварным дэфіцытам і ростам цэн, у тым ліку на тавары першай неабходнасці, напярэдадні Новага года.

Ударыць такая сітуацыя і па транспартных кампаніях. Напрыклад, у Літве больш за 150 адпаведных прадпрыемстваў разарылася, а фінансава моцныя імкнуцца пайсці пад юрысдыкцыю любой суседняй дзяржавы, каб не мець спраў з урадам Літвы і дзяржструктурамі, якія працуюць у яго інтарэсах. Перад намі праблема не транспартнага, а палітычнага характару, заўважае Baltnews. «Ваенна-акопная рыторыка павінна знікнуць са знешняй палітыкі. Ніколі яна не прыносіла поспехаў, не прынясе і сёння», — заўважыў дэпутат літоўскага сейма Гінтаўтас Палуцкас. Важна, каб гэта зразумелі тыя, хто стварае перашкоды. Інакш разам з бежанцамі да граніцы падыдуць і змучаныя шматдзённымі чэргамі дальнабойшчыкі.

**Пётр ДУНЬКО.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Арэшкін апісаў тры сцэнарыі развіцця сітуацыі з новым штамам каранавіруса

**Памочнік прэзідэнта Расіі Максім Арэшкін апісаў тры сцэнарыі развіцця сітуацыі з новым штамам каранавіруса «Амікрон», паведамляе РІА «Навіны».**

Паводле яго слоў, уся эканамічная палітыка і эканамічная сітуацыя цяпер залежаць ад каранавіруса. «Ёсць сцэнарый негатыўны, цяжкі. Гэта ў тым выпадку, калі вірус будзе распаўсюджвацца хутчэй, калі цяжкасць захворвання застанецца высокая і пры гэтым ён зможа абыходзіць існуючыя вакцыны, існуючыя тэсты», — сказаў Арэшкін. Другі сцэнарый — гэта несапраўдная трывога, калі «Амікрон» будзе не такі небяспечны і пра гэты штам хутка забудуцца. Трэці варыянт развіцця падзей — цяжкасць захворвання будзе не вельмі высокая, але вірус будзе распаўсюджвацца хутка. Пры такім сцэнарыі новы штам можа выцесніць «дэльту» з папуляцыі, і пры гэтым цяжкасць захворвання будзе меншая», — заявіў памочнік прэзідэнта. Арэшкін дадаў, што для эканамічнай палітыкі важна не варажыць, які сцэнарый рэалізуецца, а важна быць гатовымі да любога з іх.

### NASA запусціла ў космас карабель з місіяй па знішчэнні астэроідаў

**Касмічны карабель NASA DART быў запушчаны з місіяй па выпрабаванні тэхналогіі, якая дапаможа збівацьз курсу небяспечныя астэроіды ў выпадку пагрозы іх падзення на Зямлю, паведамляе ВВС.**

Мэтай карабля стануць два астэроіды. Буйнейшы з двух аб'ектаў, Дыдзім, мае памер каля 780 м, а яго меншы «кампаньён» Дыморф — каля 160 м. Касмічны карабель мусіць урэзацца ў Дыморф, каб змяніць траекторыю яго палёту.

Аб'екты памерам з Дыморф могуць узарвацца з энергіяй, якая ў шмат разоў перавышае звычайную ядзерную бомбу, спустошыўшы населены пункты і пакінуўшы дзясяткі тысяч ахвяр. Астэроіды дыяметрам каля 300 м могуць выклікаць разбурэнні ў маштабах усяго кантынента, а астэроіды памерам больш за 1 км могуць выклікаць глабальныя наступствы.

Пераадолеўшы гравітацыю Зямлі, DART будзе рухацца па сваёй арбіце вакол Сонца. Карабель урэжацца ў Дыморф на хуткасці каля 6,6 км/г. Апошняе павінна змяніць хуткасць аб'екта ўсяго на долю міліметра ў секунду. Гэта вельмі невялікі зрух, але яго можа быць дастаткова, каб адвесці аб'ект ад сутыкнення з Зямлёй.

### Заяву Зяленскага аб дзяржперавароце назвалі няўдалым жартам

**Былы спікер Вярхоўнай Рады Дзмітрый Разумкоў назваў няўдалым жартам заяву прэзідэнта Украіны Уладзіміра Зяленскага аб падрыхтоўцы дзяржпеpавароту з удзелам алігарха Рыната Ахметава.**



Разумкоў адзначыў, што словы прэзідэнта аб падрыхтоўцы дзяржперавароту — «гэта больш чым сур'ёзна», таму ён чакаў пачуць пра затрыманні або арышты.

«Але сёння ўжо 30-е чысло, і нічога не адбываецца. Таму гэта ці прэзідэнт так пажартаваў, і гэта быў вельмі няўдалы жарт, ці павінны быць прадстаўлены рэальныя факты, што на самай справе адбываецца», — заявіў экс-кіраўнік Рады.

Калі ўлады сцвярджаюць, што 1 снежня будзе дзяржпераварот, то «трэба краіну рыхтаваць», лічыць Разумкоў. «А калі гэта так проста сказалі і забыліся — я не ведаю, як гэта каментаваць. Гэта абсалютна несур'ёзная дзяржаўная пазіцыя, абсалютна несур'ёзны дзяржаўны падыход», — сказаў на заканчэнне ён.

Зяленскі на прэс-канферэнцыі 26 лістапада заявіў, што, паводле атрыманай ім інфармацыі, ва Украіне 1 снежня плануецца дзяржпераварот.

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

# ДАІ заклікае да ўвагі

**Дзяржаўтаінспекцыя просіць усіх удзельнікаў дарожнага руху быць вельмі ўважлівымі ў складаных умовах надвор'я, якія склаліся ў апошнія дні, у прыватнасці пры галалёдзіцы. Такая інфармацыя размешчана ў тэлеграм-канале УДАІ ГУУС Мінгарвыканкама.**

Пры планаванні паездак кіроўцы павінны ўлічваць надвор'е, стан свайго транспартнага сродку і ўласныя навыкі ваджэння ў зімовых умовах. У галалёд асноўная частка аварый адбываецца менавіта на паваротах. Каб бяспечна праехаць паварот, неабходна загадзя зменшыць хуткасць, пазбягаць рэзкіх маніпуляцый.



Фота БелТА.

Кіроўцам трэба трымаць дыстанцыю, асабліва пры галалёдзе, якую неабходна павялічваць, і яна павінна быць большая ў 2-3 разы, чым пры яздзе ў летні перыяд. У галалёд тармазны шлях значна павялічваецца. Акрамя таго, неабходна правільна праязджаць пешаходны пераход. У галалёд ёсць рызыка, што перад пешаходам кіроўца не паспее затармазіць. Каб гэтага не адбылося, рэкамендуецца загадзя зменшыць хуткасць перад пешаходным пераходам, нават калі на ім нікога няма.

Пешаходам перасякаць дарогу трэба толькі ва ўстаноўленых месцах. Катэгарычна забараняецца перабягаць праезную частку: гэта можа прывесці да падзення. Нават на рэгуляваных пераходах нельга пачынаць рух, пакуль усе аўтамабілі не спыняцца. У цёмны час сутак не трэба забываць пра выкарыстанне святлоадбівальных элементаў.

# ЦЫГАРЭТА ПАДВЯЛА

### Злачынцу знайшлі ў выніку генетычнай экспертызы

**Жыхарка Ваўкавыска заўважыла, што ў яе аўтамабілі нехта пабываў і пашкодзіў маёмасць. Яна выклікала міліцыю. Следча-аператыўная група знайшла на месцы здарэння цыгарэту і кепку. Паколькі гэтыя рэчы не належалі аўтаўладальніцы, было выказана меркаванне, што іх тут пакінуў зламыснік.**



Знайсці ўладальніка пакінутых у аўтамабілі цыгарэты і кепкі ўдалося пасля правядзення судовай генетычнай экспертызы. Атрыманы генетычны матэрыял быў звераны з базай даных ДНК Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз. У ёй знайшлося супадзенне з асобай, якая кантактавала з дадзенымі прадметамі. Парушальнікам закона аказаўся раней судзімы жыхар Ваўкавыска 1961 года нараджэння. Ён затрыманы, вядзецца праверка.

Па словах **начальніка ўпраўлення лабараторных даследаванняў ДКСЭ па Гродзенскай вобласці Сяргея АРАНОВІЧА**, штогод праводзіцца больш за дзве тысячы біялагічных і генетычных экспертыз. І менавіта гэтыя вынікі часта становяцца галоўным доказам віны пры расследаванні крымінальных спраў.

**Маргарыта УШКЕВІЧ, фота УДКСЭ.**

# Таленты шчырых сэрцаў

**Абласная выстаўка творчасці людзей з абмежаванымі магчымасцямі запрацавала ў выставачнай зале Гродзенскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці. Яна накіравана на папулярызацыю творчасці інвалідаў і прыцягненне ўвагі грамадскасці да іх праблем.**

Наведвальнікі змогуць убачыць больш за 200 работ людзей з абмежаванымі магчымасцямі з 13 раёнаў вобласці, якія наведваюць аддзяленні дзённага знаходжання для інвалідаў пры ўстановах сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, а таксама клубныя ўстановы. Большая частка экспанатаў прадстаўлена ўдзельнікамі Гродзенскай абласной арганізацыі ГА «БелТІЗ».

У экспазіцыі — работы, выкананыя ў розных тэхніках выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (жывапіс, разьба па дрэве, вышыўка, тэкстыль, пляценне з папяровай лазы, арыгамі, бісерапляценне, вязанне і інш.), у тым ліку сувеніры да Новага года.

# ШКОЛЬНЫЯ АБЕДЫ СУПРАЦЬ ФАСТ-ФУДУ



## «Дзяжурную» катлету ядуць не ўсе

У школьнай сталоўцы горада Гродна рыхтуюцца да прыёму чарговай групы школьнікаў. На абед прыйдуць вучні малодшых класаў. У меню — рысавая каша з катлетай і марынаваным агуркам. На дэсерт — печыва з сокам. Безумоўна, асноўная страва карысная і дыетычная. Але, відавочна, далёка не кожнаму спадабаецца. Настаўніца пачатковых класаў Алёна Фёдараўна канстататуе: «Так. Дзеці цяпер пераборлівыя». «А што яны добра ядуць?» — пытаюся. «Каўбасу вараную, сасіскі. Гэта амаль усе ядуць, магчыма, таму, што так прывычаныя дома. Яшчэ добра ядуць свіныя катлеты, курыныя — горш, любяць плоў. А вось тварожную запяканку ядуць адзінкі, большасць пакідае некранутай».

Сапраўды, у многіх малодшых школьнікаў значная частка порцыі так і засталася на талерцы, якую пасля абеду дзеці панеслі у раздатачны блок. Праўда, па словах работнікаў кухні, у старшакласнікаў талеркі чысцейшыя, яны ядуць лепш.

Праблема школьнага харчавання заўсёды выклікала спрэчкі. Недаедзеныя порцыі былі заўсёды. Між тым галоўнае патрабаванне да арганізатараў харчавання адно — дзеці ў школе павінны быць сытыя. Такую думку падчас маніторынгу выказвае **член Пастаяннай камісіі Нацыянальнага сходу Беларусі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Алёна ПАТАПАВА.** Як прафесійны педагог і маці, яна лічыць важным для здароўя правільнае і збалансаванае харчаванне школьнікаў падчас вучэбнага працэсу. Многія дзеці праводзяць у школе цэлы дзень, застаюцца на дадатковыя заняткі, трэніроўкі. Таму неабходна, каб яны своечасова і якасна харчаваліся.

## Нормы ніхто не адмяняў

Меню школьніка ўлічвае цэлы шэраг нарматыўных паказчыкаў. У першую чаргу, існуюць грашовыя нормы, якія адпавядаюць кожнай узроставай катэгорыі. Ёсць нормы харчавання з улікам сезоннасці. Напрыклад, больш натуральных прадуктаў прыпадае на вясну і восень. Для дзяцей з асобнымі відамі захворванняў складаецца спецыяльны рацыён. Таксама меню ўлічвае асартымент спажывецкага рынку і магчымасці тэхналагічнага абсталявання. Ну і, вядома, падлічваецца энергетычная каштоўнасць кожнай стравы. Як расказала **намеснік дырэктара камбіната школьнага харчавання Ленінскага раёна Гродна Ірына ВАЎЧКЕВІЧ,** меню распрацоўваецца на навуковай аснове, кожныя дзесяць дзён аналізуецца выкананне нормаў і пры неабходнасці карэкціруецца.

— Самая карысная ежа — свежапрыгатаваная, таму ва ўсіх школах наладжана сістэма гарачага харчавання, — адзначыла суразмоўніца. — У нас арганізавана цэнтралізаваная дастаўка прадуктаў, але ёсць школы, дзе прывазное харчаванне, мы гатуем на іншых базах і дастаўляем абеды ў школы па 4-5 разоў на дзень. Такіх устаноў адукацыі ў Гродне ўсяго некалькі.

Як правіла, большасць школьнікаў сілкуецца ў школьных сталоўках. Прыносіць хатнюю ежу не рэкамендуецца з-за даволі высокіх патрабаванняў па тэрміне яе захавання. І ўвогуле атрымаць кашу з катлетай лепш, чым даваць дзіцяці нейкі бутэрброд з сабой, лічыць Іна Ваўчкевіч. У школе харчаванне якаснае, утрыманне солі невялікае, апрацоўка ежы ашчадная. Ды і кошт школьнага абеду прымальны. У залежнасці ад узросту школьніка на дзень плата за абед складае ад 1 рубля 70 капеек да 2 рублёў 5 капеек. Значная частка датуецца дзяржавай. Школьнікі 1—4 класаў харчуюцца бясплатна.

## Ці такі прывабны шведскі стол?

Алёна Патапава згадвае, што яе дачка падчас вучобы ў школе была прыхільніцай шведскага стала. Але наўрад ці гэта можна назваць паўнавартасным харчаваннем. Як правіла, усе дзеці выбіраюць смажанку альбо замяняюць гарачы абед перакусамі.

— Страчваецца сам сэнс школьнага харчавання — атрымаць здаровую дыетычную ежу, — упэўнена дэпутат. — На самай справе шведскі стол павінен прадугледжваць некалькі варыянтаў нармальнага здаровага абеду, карыснай гарачай стравы — мяса альбо рыбы. І калі школьнік можа менавіта з гэтага абраць, тады ўсё будзе добра і правільна. Але такі падыход патрабуе дадатковых тэхнічных магчымасцей як школы, так і камбіната школьнага харчавання.

Па прынцыпе шведскага стала ў Гродне харчаваннем ахоплена каля 20 % устаноў адукацыі. Як правіла, з невялікай колькасцю вучняў. А ў новых мікрараёнах школы налічваюць больш за дзве тысячы чалавек. Наладзіць шведскі стол для такой колькасці праблематычна. У сваю чаргу, арганізатары школьнага харчавання шукаюць нешта новае, каб зацікавіць вучняў, і сочаць за тым, каб было менш адходаў.

— Відавочны ўплыў фаст-фуду на дзяцей: мы атрымліваем заяўкі з просьбай выключыць рыбу, кашы, — расказвае Іна Ваўчкевіч. — У якасці альтэрнатывы і дадатковага харчавання ў нас паўсюдна працуюць буфеты, дзе мы рэалізоўваем новыя віды страў, блізкіх да фаст-фуду. Гэта ролы з птушкі, бургеры з ашчаднай цеплавой апрацоўкай, дазволеныя для харчавання дзяцей. Распрацоўваецца некалькі відаў арганізацыі харчавання, у тым ліку з элементамі шведскага стала. Там ёсць варыянты меню на выбар. Так удаецца накарміць больш школьнікаў, папоўніць запас іх энергіі, якая расходуецца падчас вучобы.

## Маніторыць, каб палепшыць

За выкананнем нормаў харчавання ў школах вобласці вядзецца кантроль. Маніторынг ахоплівае ўвесь спектр мерапрыемстваў — ад санітарна-эпідэмічных да тэхналогіі гатавання страў. Як расказала **начальнік упраўлення КДК Гродзенскай вобласці Наталля ЖУР,** асноўныя парушэнні звязаны менавіта з гатаваннем ежы. Гэта недакладданне сыравіны і малаважкія порцыі. Напрыклад, агульная вага порцыі адпавядае нормам, але ў ёй асноўну складае гарнір, а вось мяса ці рыбы менш, чым патрабуецца. Падчас такога маніторынгу ў адной са школ вобласці выяўлены недахоп мяса ў смажаніне амаль напалову. Праўда, такія выпадкі вельмі рэдкія, адзначылі ў кантрольным ведамстве.

— У кастрычніку мы правялі аналіз меню ў асобных школах. Рацыён паказаў, што ніжэй за норму выкарыстоўваліся такія прадукты, як мяса, птушка, садавіна, малако і кісламалочныя прадукты. Затое макароны і кандытарскія вырабы прысутнічалі звыш устаноўленых нормаў, — дадае прадстаўнік дзяржкантролю.

Усе парушэнні не застаюцца без адпаведных мер. Аб выніках маніторынгу інфармуюцца адміністрацыі раёнаў, больш за 80 арганізатараў школьнага харчавання прыцягнута да дысцыплінарнай адказнасці.

На думку кантралёраў, настаў час перагледзець асартымент страў і нормы харчавання для школьнікаў, укараняць новыя формы і метады ў дадзенай справе.

Маніторынг з удзелам парламентарыя засведчыў, што харчаванне ў наведанай гродзенскай школе адпавядае ўсім неабходным нормам. Дэпутат Алёна Патапава лічыць, што сістэмная работа ў згаданым пытанні дае свае вынікі.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Знешнія рынкі

# Розныя брэнды — адна стратэгія

## У Гродне ўзнагародзілі рэгіянальных лаўрэатаў нацыянальнага конкурсу «Найлепшы экспарцёр года — 2020»

**Конкурс адносна малады, ён стартаваў у 2016-м. Сёлета цырымонія праводзіцца не ў сталіцы, як звычайна, а ў рэгіёнах. У Гродне вызначаны тры намінанты. Усе яны прадстаўляюць розныя галіны вытворчасці, але маюць найлепшыя аб'ёмы экспарту, высокія тэмпы яго росту, значнае знешнегандлёвае сальда, а таксама шырокую геаграфію паставак. Усе яны працуюць не толькі на эканамічны патэнцыял краіны, але і на яе імідж. Так, тры прадпрыемствы-лаўрэаты выйшлі на рынкі 40 краін свету, а аб'ём іх экспарту склаў за мінулы год амаль 100 мільёнаў долараў.**

Як адзначыў **старшыня Беларускай гандлёва-прамысловай палаты Уладзімір УЛАХОВІЧ,** конкурс на найлепшага экспарцёра стаў прэстыжнай пляцоўкай для спаборніцтва вядучых беларускіх прадпрыемстваў. Усе яны ўносяць значны ўклад у агульную справу, якая садзейнічае не толькі развіццю эканомікі, але і ў цэлым працуе на папаўненне бюджэту. А гэта забяспечвае ўзровень жыцця беларусаў. Да таго ж высокая якасць прадукцыі і паслуг фарміруе пазітыўны імідж краіны на міжнароднай арэне. Нягледзячы на ўсе абмежаванні, за шэсць месяцаў Беларусь атрымала дадатны знешнегандлёвы баланс. Па выніках дзевяці месяцаў ён склаў звыш двух мільярдаў долараў.

— Невялікая Беларусь больш за 70 % прадукцыі здольная прадаць на знешніх рынках. Геаграфія даволі значная — 180 краін свету, прычым па некаторых відах, асабліва што датычыцца харчовай вытворчасці, мы глабальныя лідары. І заўсёды нам было важна адзначаць тых, хто ўдала працуе на знешніх рынках, — падкрэсліў Уладзімір Улаховіч. — У Гродзенскай вобласці добра развіты і прамысловы, і аграрны сектары. Ёсць вядомыя брэнды, якія высока ацэнены на міжнародных рынках.

Гродзеншчына пастаўляе сваю прадукцыю ў 90 краін свету. Пастаянна ідзе прырост паставак па харчовай прамысловасці, новыя рынкі з'явіліся на афрыканскім кантыненце. Эканоміка рэгіёна, як і краіны ў цэлым, арыентавана на экспарт.

— Для нас вельмі важна нарошчваць пастаўкі прадукцыі за межы краіны, — дадаў **намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віталь НЯВЕРА.** — Штогод прадпрыемствы актыўна пашыраюць рынкі збыту, працуюць над павышэннем якасці і канкурэнтаздольнасці тавараў. І хоць мінулы год быў даволі няпросты, але рэгіён здолеў павялічыць экспарт. Значная заслуга ў гэтым належыць, у першую чаргу, нашым пераможцам і лаўрэатам нацыянальнага конкурсу на найлепшага экспарцёра.

Другі год запар найлепшым у намінацыі «Мясная вытворчасць» становіцца ААТ «Гродзенскі мясакамбінат». Прадпрыемствы даволі актыўна займаецца асваеннем новых відаў прадукцыі. Гэтаму садзейнічаюць як значныя інвестыцыі ў сыравінную базу, так і пастаяннае пашырэнне вытворчых плошчаў. Сёлета да камбіната далучылі яшчэ адзін участак у Лідзе з мінулага месяца.



— Каб экспарт рос, мы пашыраем аб'ёмы. На новым участку былога мясакамбіната ў Лідзе будзе выпускацца папулярная ў тым ліку на расійскім рынку лінейка, якая стала «фішкай» камбіната. Гэта сыравэнджаныя, сыравяленыя каўбасныя вырабы. Кітай бярэ ялавічыну ў любых аб'ёмах і выглядзе. Мы актыўна ў гэтым плане працуем, — расказаў **генеральны дырэктар камбіната Алег ІВАНОЎ.**

Больш за 10 гадоў працуе на рынку паслуг ТАА «БелБурБуд». Будаўнічая кампанія ўвайшла ў тройку рэгіянальных дыпламантаў конкурсу. Дзякуючы наяўнасці кваліфікаваных кадраў і высокатэхнічнага абсталявання кампаніі ўдаецца выйграваць тэндары і трапляць на аб'ект пры пэўнай канкурэнцыі. Поспех у намінацыі «Будаўніцтва і вытворчасць будаўнічых матэрыялаў» забяспечыла якасная работа на аб'ектах з замежным капіталам.

Літаральна з аэрапорта трапіў на цырымонію ўзнагароджання **генеральны дырэктар ААТ «Праймілк» Анатоль БЯЛЯЎСКІ.** Ён прыляцеў з Арабскіх Эміратаў, дзе гэтымі днямі вядуцца перагаворы па прасоўванні на ўсходні рынак новай прадукцыі — мяккага сыру «Рыкота». Лінія магутнасцю 30 тон сыру ў суткі запушчана на прадпрыемстве зусім нядаўна.

— Мы працуем з чатырма партнёрамі ў Эміратах. Пры гэтым спецыфіка арабскага рынку ў тым, што яны хочуць эксклюзіву на ўсе пастаўкі, — заўважыў Бяляўскі. — Цяпер праходзіць вялікая дэгустацыйная камісія, пасля чаго нашы повары будуць гатаваць чызкейкі з мяккага сыру. Мы можам пастаўляць ужо 200 тон.

У хуткім часе тут плануюць запусціць яшчэ адну лінію па вытворчасці мяккага сыру і больш актыўна асвойваць усходнія рынкі. Сёння 40 % асноўнага прадукту — сухога парашку малочнай сыроваткі — ідзе ў Расію. Але на прадпрыемстве шукаюць шляхі дыверсіфікацыі экспартных паставак, таму вывучаюць рынкі Паўднёвай Амерыкі. І, трэба сказаць, даволі паспяхова. Гродзенскае прадпрыемства амаль што першае на постсавецкай прасторы змагло наладзіць пастаўкі малочнай прадукцыі праз акіян. Стабільна ідзе супрацоўніцтва з Перу, Венесуэлай, Чылі, Бразіліяй. Сапраўдным прарывам, лічаць на прадпрыемстве, стала Японія. Цяпер вядзецца актыўная работа па пастаўках у Алжыр — новы для беларускай малочнай вытворчасці рынак збыту.

**Матэрыялы падрыхтавала Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.**

Жыццялюбы

# ЗВАРШЧЫК З ДУШОЙ СКУЛЬПТАРА

## Пенсіянер стварыў у сваім двары незвычайны заапарк

**Ці ведалі вы, што ў Мінску можна бясплатна пабачыць жырафу, кенгуру, пелікана, насарога, панду, кракадзіла? Каб падзівіцца на гэтых ды іншых экзатычных жывёл дастаткова даехаць на трамваі, што ідзе ў бок Зялёнага Луга, да канечнага прыпынку. Менавіта там, побач з Полацкім паркам, месціцца пенапластавы заапарк пад адкрытым небам.**



Пенсіянер стараўся рабіць жывёл, якіх у штодзённым жыцці не пабачыш. Каб дзеці іх не толькі па кніжках вывучалі.

З'явіўся гэты рукатворны цуд у двары дома № 30 на вуліцы Сядых амаль 15 гадоў таму. І ўсё дзякуючы незвычайнаму захапленню самага звычайнага пенсіянера.

З Анатолем Жданам я пазнаёмілася гадоў пяць таму. Тады яшчэ жыла ў Мінску, якраз непадалёк ад легендарнага дворыка. Часта, праходзячы міма, размаўляла з дзядулем. Даведалася, што ён не мае мастацкай адукацыі. Усё жыццё прапрацаваў зваршчыкам. А пасля выхаду на пенсію ў яго не толькі з'явілася шмат вольнага часу, але і адкрылася другое дыханне.

— Неяк адпачывалі з жонкай за горадам, — згадвае Анатоль Уладзіміравіч. — Па дарозе дадому завіталі ў прыдарожнае кафэ перакусіць. Менавіта там я і пабачыў прыгожую фігурку бусла. І мне захацелася мець падобную пад вокнамі свайго дома. Так загарэўся ідэяй, што ў той жа дзень заехаў на «Экспабел», у садовы цэнтр. Але бусел у натуральную велічыню быў мне не па кішэні. Таму вырашыў змайстраваць яго сам. З чаго? З гліны ці з дрэва? Мне падалося, гэта вельмі складана. І тут пад рукі трапіліся kавалкі пенапласту.



Дах гаража, дзе майстар-самавук выразаў свае фігуркі, і сёння ўпрыгожвае той самы першы бусел, з якога ўсё пачыналася.

Усё жыццё Анатоль Ждан працаваў з металам. Таму каркас фігуры вырашыў зварыць з арматуры, а потым абклеіць пенапластам і пафарбаваць. Паспрабаваў — атрымалася.

— Паставіў я самаробнага бусла на дах свайго гаража, — усміхаецца Анатоль Уладзіміравіч. А суседзі кажуць: «Рабі гняздо». Неўзабаве ў тым гняздзе з'явілася і бусляня. А потым і сам не прыкмеціў, як «заапарк» стаў разрастацца. Каб нікому не было сумна, кожнай жывёле рабіў пару.

Натхненне майстар-самавук шукаў у дзіцячых кніжках. Для гэтага нават спецыяльна у бібліятэку хадзіў. Спадабаўся нейкі малюнак — капіраваў сабе ў нататнік. А потым ужо дома выразаў з пенапласту. Стараўся рабіць жывёл, якіх у штодзённым жыцці не пабачыш. Каб дзеці іх не толькі па кніжках вывучалі.

Спачатку свой заапарк Анатоль Уладзіміравіч абгарадзіў нізенькай драўлянай агароджай. Але дзеці пералазілі цераз яе, каб пагладзіць то белага мядзведзя, то зубра... І хочаш не хочаш, але пашкоджвалі фігуркі. Некалькі пенапластавых жывёлак наогул бясследна знікла. «Напэўна, хтосьці сабе на лецішча забраў», — мяркуе майстар-самавук. Таму прыйшлося паставіць высокую агароджу. Зрабіў Анатоль Ждан яе таксама сваімі рукамі. З металічных трубак і... паліц ад старых халадзільнікаў.

— Відаць, маё ноу-хау людзі запазычылі. Бо на сметніках сталі з'яўляцца халадзільнікі без паліц *(смяецца)*...

Пенапласт майстар прыносіў з мясцовага «універмага». Так ён называе сметнік. Там, кажа, можна знайсці што заўгодна. Людзі ж пастаянна робяць рамонт у кватэрах, выкідаюць каробкі з-пад тэлевізараў, бытавой тэхнікі...

Пенапласт — вельмі танны і даўгавечны матэрыял. Фігуры, зробленыя з яго, не гніюць у адрозненне ад драўляных. Адзінае, што сарокі і вароны часам яго дзяўбуць ды фарба аблазіць і выцвітае. Таму, каб жывёлы былі як новенькія, прыходзіцца рэгулярна іх падфарбоўваць.

Абнаўленнем свайго заапарка пенсіянер пачынае займацца вясной. Узімку ж збірае грошы на фарбы. Адкладае іх са сваёй пенсіі. Дапамагаюць і неабыякавыя людзі, хто чым можа.

**Пенапласт майстар прыносіў з мясцовага «універмага». Так ён называе сметнік. Там, кажа, можна знайсці што заўгодна. Людзі ж пастаянна робяць рамонт у кватэрах, выкідаюць каробкі з-пад тэлевізараў, бытавой тэхнікі...**

Некалькі гадоў таму на заборы імправізаванага заапарка з'явіліся надпісы: «Дапаможыце (матэрыяльна) захаваць прыгажосць гэтых жывёлак. Ім патрэбны рамонт. Буду вельмі Вам ўдзячны».

— Ідэя не мая, — прызнаецца Анатоль Уладзіміравіч. — Жанчына, якая аднойчы прынесла мне бляшанку фарбы ды пэндзлікі, падказала. Маўляў, напішыце аб'яву, і вам будуць кідаць грошы. Я так і зрабіў. Павесіў некалькі пластыкавых бутэлек з адтулінай — такія імправізаваныя скарбонкі. І сапраўды людзі пачалі кідаць туды грошы. Хтосьці — 10 капеек, а хтосьці — і 10 рублёў. Аднойчы знайшоў у скарбонцы 100 рублёў адной купюрай... І нават не паверыў сваім вачам.

На днях я была па справах у тым раёне, вырашыла праведаць старога знаёмага. Каля пенапластавага заапарка сустрэла бабулю з маленькай унучкай. Разгаварыліся. Жанчына, як аказалася, жыве ў суседнім доме. Ведае Анатоля Уладзіміравіча не першы год.

— Гэта ў сучасных шматпавярховіках людзі нават з суседзямі па пляцоўцы могуць быць не знаёмы. Мы ж тут усе адно аднаго ведаем. Памятаю, яшчэ з сынам тут гуляла. Дык тады Анатоль толькі пачынаў рабіць сваіх жывёлак. Зараз жа каго тут толькі няма... Відаць, пад сотню жывёл і птушак... Нам падабаецца гэты незвычайны дворык, часта сюды з унучкай заходзім. Я ёй паказваю, якія жывёлы бываюць, расказваю пра іх штосьці цікавае. Днямі сустрэла Анатоля, дала яму 10 рублёў на рамонт.

Неўзабаве з двухпавярховіка паказаўся і сам майстар. Звярнула ўвагу, што дзядуля заўсёды, калі бачыць (балазе, жыве на першым паверсе і вокны выходзяць у двор), што хтосьці зацікавіўся яго жывёламі, выходзіць на вуліцу. Як быццам пакурыць. Але насамрэч, неяк прызнаўся, каб проста паразмаўляць.

Вось ужо восем гадоў, як Анатоль Ждан аўдавеў. Жыве адзін. Дачка, зяць ды ўнучкі, вядома, праведваюць. Але і чужым людзям дзядуля заўсёды рады.

Адмыслова зрабіў у двары некалькі лавачак, у тым ліку і пад дахам (на выпадак дажджу ці сонцапёку), каб мінакі маглі адпачнуць і палюбавацца пенапластавымі гадаванцамі. У легендарным дворыку можна паназіраць і за сапраўднымі птушкамі. Анатоль Уладзіміравіч развесіў на бярозах шмат самаробных шпакоўняў і кармушак. Акрамя таго, зусім побач ёсць каларытная галубятня, за якой даглядае яшчэ адзін жыццялюб з суседняга дома.

За той час, што мы не бачыліся, Анатоль Уладзіміравіч амаль не змяніўся. Усё гэтак жа свецяцца вочы, калі расказвае пра свой заапарк, пра неабыякавых людзей, якія яму дапамагаюць. Праўда, прызнаўся, з кожным годам даглядаць немалую рукатворную гаспадарку яму ўсё цяжэй і цяжэй. Узрост дае пра сябе ведаць: 80 гадоў як-ніяк.

**Усё жыццё Анатоль Ждан працаваў з металам. Таму каркас фігуры вырашыў зварыць з арматуры, а потым абклеіць пенапластам і пафарбаваць. Паспрабаваў — атрымалася.**

Нягледзячы на тое, што на дварэ лістапад, побач з пенапластавымі гадаванцамі квітнеюць хрызантэмы розных колераў: белыя, ружовыя, жоўтыя, бардовыя... Кветкі — яшчэ адно захапленне і крыніца натхнення дзядулі (быў час, сам іх разводзіў, чаранкаваў).

— Зараз ужо амаль усе адцвілі, — кажа на развітанне Анатоль Уладзіміравіч. — Летам абавязкова прыходзь. Я новых гатункаў руж і цюльпанаў пасадзіў. Сілы ўжо не тыя, але душа ўсё адно прагне прыгажосці.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК, фота аўтара.**

Цікавы досвед

# «КАЛІ Б Я БЫЎ СТАРШЫНЁЙ РАЙВЫКАНКАМА...»

## Чаму тэлеграм-канал «BEREZA.BY» набірае ўсё больш падпісчыкаў

**Цяпер многія пытанні грамадскага жыцця жыхары Бярозаўскага раёна абмяркоўваюць у тэлеграм-канале BEREZA.BY. Там жа яны чытаюць самыя аператыўныя навіны горада і раёна. Канал створаны рэдакцыяй раённай газеты «Маяк», яго назва адпавядае назве сайта райгазеты.**

**Намеснік старшыні райвыканкама Леанід КАЧЫНА** кажа, што на абмеркаванне выносяцца самыя розныя пытанні, гаворыцца пра тое, што хвалюе людзей.

— Напрыклад, так склалася гістарычна, што двары амаль усіх гарадскіх школ у нас прахадныя. Людзі скарачаюць шлях, перасякаючы двор. Цяпер, як вядома, асаблівая ўвага аддаецца пытанням бяспекі. Мы вырашылі, што прыйшоў час зрабіць двары закрытымі. Спачатку гэтую тэму выносім на старонкі раённай газеты, потым запускаем абмеркаванне ў тэлеграм-канале. І большасць людзей прапанову падтрымлівае. Праўда, былі і такія водгукі: мне, маўляў, на пяць мінут больш давядзецца кожны дзень хадзіць да прыпынку, а гэта няпручна. Але ж трэба разумець, што бяспека школьнікаў — пытанне першачарговае, гэта важней, чым пэўныя няпручнасці. Так і пісалі, дарэчы, многія падпісчыкі.

— Некаторыя пытанні нават нечакана для нас выклікалі бурную дыскусію, — працягвае Леанід Іванавіч. — Напрыклад, пацікавіліся меркаваннем падпісчыкаў пра цывілізаваны спосаб выгулу сабак. Прапанавалі зрабіць асобную пляцоўку для выгулу. Гэта выклікала буру эмоцый у тых, хто прывык гуляць з гадаванцам паўсюль. Іншыя людзі, мякка кажучы, не падтрымалі апанентаў. Той выпадак, калі ў спрэчцы нараджаецца мо не ісціна, дык знаходзіцца рацыянальнае зерне для вырашэння праблемы.

— Цяпер на нашым канале крыху больш за 2300 падпісчыкаў. Колькасць іх паступова расце, — сказаў **галоўны рэдактар газеты «Маяк» Аляксандр КРАГЕЛЬ.** — Канал мы запусцілі яшчэ летась, але актыўна ён стаў развівацца са жніўня-верасня, што звязана з прыходам загадчыцы аддзела інтэрнэт-рэсурсаў Аляксандры Дзербіс. Ідуць пастаянныя рубрыкі, навіны аператыўна абнаўляюцца сем дзён на тыдзень, актыўна выкарыстоўваюцца сацыяльныя сеткі.

...Так і ёсць, адкрываю тэлеграм-канал, скажам, 19 лістапада, у пятніцу. Чытаю падрабязны прагноз надвор'я на дзень, далей звесткі пра святы: акрамя таго, што ў нас Дзень ракетных войскаў і артылерыі, сёння ж адзначаюцца Міжнародны мужчынскі дзень і Дзень жаночага прадпрымальніцтва.

Далей паведамленне аб тым, як член Савета Рэспублікі, старшыня Брэсцкага абласвета Юрый Наркевіч правёў прыём грамадзян у Малечы, гэта буйны населены пункт Бярозаўскага раёна. Тут коратка пералічаны спіс праблем, якія ўздымалі грамадзяне на прыёме, і прыведзена спасылка, па якой можна перайсці на сайт газеты, дзе размешчаны падрабязны матэрыял на адпаведную тэму. Тэлеграм-канал працуе ў звязцы з электронным рэсурсам газеты.

Таксама на канале пазначаны тэмы апытанняў месяца, якія праводзіць газета. Напрыклад: «Калі б я быў старшынёй райвыканкама, ...начальнікам аддзела па архітэктуры і будаўніцтве, ...дырэктарам Дома культуры». Людзі пішуць свае прапановы, сваё бачанне вырашэння праблем. Самыя цікавыя адказы і разважанні змяшчаюцца на сайце, а тэлеграм-канал нагадвае пра тое сваім падпісчыкам.

На канале можна знайсці агляды свежага нумара газеты, паведамленні аб здарэннях, паглядзець курсы валют, звесткі пра сітуацыю з пандэміяй.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

Без тэрміну даўнасці

# АНТЫБЕЛАРУСКАЕ ПАДПОЛЛЕ

**Дзейнасць антысавецкага падполля на тэрыторыі Беларусі ў гады Другой сусветнай вайны, а таксама ў пасляваенны перыяд дагэтуль з'яўляецца адной з найбольш складаных тэм у беларускай гісторыі. Нягледзячы на тое што, пачынаючы з 1990-х гадоў у нашай краіне выйшла шмат навуковых публікацый, прысвечаных дзейнасці польскага антысавецкага падполля на тэрыторыі БССР, аб рэальных фактах ведаюць у асноўным даследчыкі, якія вывучаюць тэматыку. У сваіх інтарэсах гэта спрабуюць выкарыстоўваць асобныя беларускія і замежныя аўтары, распаўсюджваючы праз сацыяльныя сеткі і месенджары «альтэрнатыўныя» погляды, далёкія ад навуковай аб'ектыўнасці, але якія выклікаюць інфармацыйны хайп.**



Байцы злучэння Арміі Краёвай «Поўдзень».

Аб тым, чаму навуковыя гіпотэзы саступілі месца безапеляцыйным палітычным заявам, а масавая гістарычная свядомасць аказалася перад пагрозай быць адкінутай да ўзроўню значна горшага, чым у перыяд халоднай вайны, карэспандэнту «Звязды» расказаў **галоўны саветнік Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў, кандыдат гістарычных навук Ігар ВАЛАХАНОВІЧ**.

***— Ігар Аляксандравіч, дзейнасць польскага падполля на тэрыторыі Беларусі была вельмі супярэчлівай. Чаму нават сёння, калі ўжо пасля тых падзей прайшло шмат гадоў, складана ёй даць ацэнку?***

— Тэматыка, звязаная з дзейнасцю антысавецкага падполля на тэрыторыі Беларусі падчас Другой сусветнай вайны, а таксама ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе, амаль не вывучалася ў савецкі перыяд. І на гэта быў шэраг прычын. Па-першае, савецкая краіна з'яўлялася шматнацыянальнай дзяржавай, і для таго, каб не правакаваць міжнацыянальныя канфлікты, у тым ліку антысавецкая дзейнасць польскай Арміі Краёвай не афішыравалася. Адбывалася гэта яшчэ і таму, каб не абвастраць палітычнае становішча: тое, што савецкай уладзе шмат гадоў актыўна супрацьстаялі сілы антысавецкага ўзброенага падполля, магло выклікаць шмат пытанняў. Як такая моцная краіна, якая перамагла нацысцкую Германію, на працягу дзесяцігоддзя пасля заканчэння вайны не магла нейтралізаваць узброеныя антысавецкія фарміраванні, што негатыўна ўплывалі на ўнутрыпалітычную і знешнепалітычную сітуацыю ў заходнім рэгіёне Савецкага Саюза, у тым ліку БССР? Калі пагледзець сродкі масавай інфармацыі таго перыяду — рэспубліканскія, рэгіянальныя, — мы там не знойдзем інфармацыю пра маштабы і трагічныя вынікі дзейнасці антысавецкага ўзброенага падполля. І нават у пасляваенных выступленнях міністра дзяржаўнай бяспекі БССР Лаўрэнція Цанавы на партыйных з'ездах не гаварылася аб тым, што існуюць узброеныя антысавецкія фарміраванні, якія здзяйсняюць тэракты ў адносінах да супрацоўнікаў органаў бяспекі, партыйных і савецкіх органаў, а таксама простых грамадзян, якія падтрымліваюць мерапрыемствы савецкай улады. Работа па іх нейтралізацыі, вядома, праводзілася, але вынікі працы не раскрываліся. Паўплывала на гэтае маўчанне і сітуацыя, абумоўленая халоднай вайной, якую Савецкаму Саюзу аб'явіў калектыўны Захад. У тых, хто знаходзіўся на нашай тэрыторыі на нелегальным становішчы, бачылі сілу, якая будзе дэстабілізаваць сітуацыю ў заходнім рэгіёне СССР і спрыяць дасягненню знешнепалітычных мэт Захаду.

***— Пры якіх умовах была створана Армія Краёва?***

— Вядома, што 17 верасня 1939 года польскі ўрад пакінуў тэрыторыю краіны і апынуўся ў эміграцыі. Адразу знаходзіўся ў Парыжы, а пасля акупацыі Францыі ў 1940 годзе трапіў у Лондан. У навуковы абарот увайшло паняцце «польскі эміграцкі ўрад у Лондане». Дык вось яшчэ ў канцы 1939 года гэты ўрад прыняў рашэнне стварыць на акупаванай тэрыторыі Польшчы ўзброенае падполле, якое б фарміравалася з ліку перш за ўсё польскіх вайскоўцаў, што засталіся там. Меркавалася, у падпольную барацьбу добраахвотна ўключацца таксама ўсе патрыятычна настроеныя палякі, перш за ўсё моладзь. Акрамя таго, на тэрыторыі Вялікабрытаніі былі створаны спецыяльныя базы, дзе з дапамогай брытанскіх вайскоўцаў і супрацоўнікаў спецслужбаў рыхтаваліся кадры, якія накіроўваліся на акупаваную тэрыторыю Польшчы, у тым ліку і для стварэння і падтрымкі дзейнасці ўзброенага падполля. Першай падпольнай арганізацыяй, якая была створана ў канцы 1939-га — пачатку 1940 гадоў, з'яўляўся Саюз узброенай барацьбы. У лютым 1942 года на яго базе была арганізавана Армія Краёва. Яна стваралася па ўзоры той польскай арміі, якая існавала на пачатак Другой сусветнай вайны.



Рэчы, адабраныя «акоўцамі» ў мірных жыхароў.

***— Што ўяўляла сабой Армія Краёва на Беларусі?***

— У адпаведнасці з тым тэрытарыяльна-адміністрацыйным дзяленнем, якое існавала ў Польшчы, Арміяй Краёвай на тэрыторыі сучаснай Беларусі былі створаны тры акругі: Навагрудская, Віленская і Палеская. На момант пачатку аперацыі «Баграціён» у іх склад уваходзіла амаль 20 тысяч узброеных «акоўцаў». Прыкладна столькі ж знаходзілася ў так званай канспіратыўнай сетцы: тыя, хто дапамагаў з харчаваннем, прадстаўляў сваё жыллё, хто знаходзіўся на легальным становішчы і перадаваў разведінфармацыю. Калі Беларусь была вызвалена, большая частка з іх засталася на савецкай тэрыторыі і, нягледзячы на тое, што ваенна-палітычная сітуацыя карэнным чынам памянялася, працягвала сваю падпольную дзейнасць ужо ў тылах войскаў Чырвонай арміі, якія ажыццяўлялі вызваленчы паход у напрамку той жа Варшавы.

***— Атрымліваецца, першапачаткова Армія Краёва была створана з мэтай барацьбы палякаў супраць нямецкай акупацыі. Што паўплывала на тое, што праз кароткі час Савецкі Саюз стаў ёй ворагам?***

— Польскае падполле арганізоўвалася адразу як антынацысцкае, так і антысавецкае адначасова. У аснову яго ідэалогіі лягла тэорыя барацьбы з «двума ворагамі» — гітлераўскай Германіяй і сталінскім Савецкім Саюзам, якія, па меркаваннях аўтараў і прыхільнікаў гэтай тэорыі, восенню 1939 года акупавалі тэрыторыю Польшчы, падзялілі яе паміж сабой і тым самым знішчылі польскую дзяржаўнасць. Такім чынам, яшчэ тады пачала сваё развіццё актуальная ў наш час тэма абвінавачвання Савецкага Саюза не толькі ў нападзе на Польшчу разам з Германіяй, але і ўвогуле — у развязванні Другой сусветнай вайны. Асноўнай мэтай дзейнасці ўзброенага падполля стала аднаўленне з ваеннай і палітычнай дапамогай Вялікабрытаніі польскай дзяржавы ў межах на верасень 1939 года і з усімі палітычнымі атрыбутамі другой Рэчы Паспалітай. Зыходзячы з такога пасылу, мы бачым, што факт уваходжання Заходняй Беларусі ў склад БССР у верасні — лістападзе 1939 года польскімі палітычнымі коламі не браўся да ўвагі. Гэта дае нам сёння падставу рабіць высновы, што польскае ўзброенае падполле ў той час было адначасова не толькі антынацысцкім, антысавецкім, але фактычна і антыбеларускім, хоць напрамую аб гэтым гаворка не ішла. Тэма аднаўлення другой Рэчы Паспалітай у межах на верасень 1939 года стала палітычнай мэтай амаль для ўсіх польскіх партый і палітычных арганізацый таго часу, якіх падтрымліваў эміграцкі ўрад у Лондане.

***— Архіўныя звесткі пацвярджаюць: польскія партызаны маюць дачыненне не толькі да барацьбы з германскімі акупантамі, але і да забойстваў савецкіх партызан і мірных жыхароў...***

— Калі пагледзець дакументы Вялікай Айчыннай вайны, асабліва перыяду ад вызвалення Беларусі да заканчэння баявых дзеянняў на савецка-германскім фронце, «акоўцы» здзяйснялі ў тыле Чырвонай арміі дыверсійныя і тэрарыстычныя акцыі. Зафіксаваныя нападзенні на чырвонаармейцаў, камандзіраў. Нават ажыццяўляліся спробы здзейсніць дыверсіі на чыгунцы. У той жа час большая частка Арміі Краёвай змагалася з нацыстамі падчас Варшаўскага паўстання. Астатнія працягвалі выконваць тыя палітычныя задачы, якія ставіліся перад імі: аднаўленне польскай дзяржаўнасці на верасень 1939 года. Калі мы пагледзім апублікаваныя ў наш час беларускімі архівістамі і даследчыкамі дакументы, шмат было загінулых не толькі з ліку супрацоўнікаў сілавога савецкага блока, ахвярамі тэрору станавіліся і простыя грамадзяне, якія падтрымлівалі савецкую ўладу: настаўнікі, супрацоўнікі савецкіх устаноў, пошты, тэлеграфа, бібліятэк. Ахвярамі былі ўсе: і беларусы, і рускія, і палякі, прадстаўнікі іншых нацыянальнасцяў. Калі весці гаворку аб перыядзе нацысцкай акупацыі рэспублікі, былі неадназовыя выпадкі, калі «акоўцы» нападалі на асобныя групы савецкіх партызан. Хоць змагаліся разам з нашымі партызанамі яны і супраць нацыстаў: былі акцыі па вызваленні Пінскай турмы, Івянца, сумесная аперацыя супраць карнікаў у раёне Налібоцкай пушчы. Аднак калі праводзіць статыстыку, то, на жаль, найбольш сутыкненняў было паміж «акоўцамі» і савецкімі партызанамі, чым паміж «акоўцамі» і немцамі.

***— Сёння некаторыя былыя «акоўцы», якія ўдзельнічалі ў барацьбе з савецкімі партызанамі і мірнымі жыхарамі, часткай польскага грамадства і палітыкаў успрымаюцца ледзь не нацыянальнымі героямі, якія змагаліся з камунізмам. Той жа Рамуальд Райс (Буры), які прымаў удзел у знішчэнні мірных беларусаў на Беласточчыне. Былі нават спробы прапагандаваць яго імя ў нашай краіне, асабліва сярод беларускіх палякаў...***

— Пачынаючы з 1990-х гадоў актыўна ідзе працэс па фарміраванні і развіцці пэўных уласных гістарычных палітык, або палітык памяці. Тэрмін узнік у 1980-я гады ў ФРГ, калі частка гісторыкаў выступіла з прапановай: хопіць немцам каяцца ў выніках Другой сусветнай вайны, трэба пагледзець на тыя падзеі па-іншаму. Такая прапанова выклікала негатыўную рэакцыю ў нямецкім грамадстве, гістарычных кругах. Гэта было ўспрынята як спроба гістарычнага рэваншу. А з канца 1990 — пачатку 2000-х гадоў у Польшчы тэрмін «гістарычная палітыка» ўзялі на ўзбраенне і навукоўцы, і палітыкі, каб заявіць і ў сябе ў грамадстве, і на міжнародным узроўні, што яны прапануюць правядзенне ўласнай гістарычнай палітыкі, каб знайсці свае гістарычныя карані і абараніць нацыянальныя падыходы ад тых краін, якія з гэтым не згодныя. Потым гэта было падхоплена краінамі Балтыі, іншымі краінамі Усходняй Еўропы, каб заявіць аб сабе па-іншаму: не так, як трактавалася іх гісторыя ў сацыялістычны перыяд ці савецкі час. А ўсё ў тым ліку дзеля таго, каб хутчэй уступіць у Еўрапейскі саюз і ваенны блок НАТА. Так узніклі тэорыі двайной ці трайной акупацыі той жа Прыбалтыкі. З той жа мэтай у Польшчы «праклятыя салдаты» падаюцца як нацыянальныя героі, у тым ліку Рамуальд Райс. У складзе Арміі Краёвай ён пачынаў сваю дзейнасць на тэрыторыі сучаснай Пастаўшчыны, потым перайшоў у Польшчу. Менавіта там ён займаўся здзекамі і вынішчэннем мірнага насельніцтва — сёння гэта можна расцэньваць як акты генацыду: ён забіваў людзей толькі таму, што яны былі беларусы і праваслаўныя.

## ЯКОЕ ДАЧЫНЕННЕ МАЕ ПОЛЬСКАЯ АРМІЯ КРАЁВА ДА НАШАЙ ГІСТОРЫІ І ЯКІ СЛЕД ПАКІНУЛІ «ПРАКЛЯТЫЯ САЛДАТЫ» Ў ГІСТАРЫЧНАЙ ПАМЯЦІ БЕЛАРУСАЎ?

***— Найбольш ад рук Бурага і яго памагатых пацярпелі праваслаўныя беларусы Беласточчыны...***

— У студзені 1946 года «праклятыя салдаты» на чале з Райсам у раёне Беластока на працягу некалькіх дзён затрымлівалі і рабавалі мясцовых жыхароў праваслаўнага веравызнання. Адпускалі толькі тых, хто ўмеў перахрысціцца па-каталіцку і прачытаць малітву «Ойча наш» па-польску. Падчас гэтай экстрэмісцкай акцыі было спалена пяць вёсак і забіта па этнічнай прыкмеце 79 праваслаўных беларусаў, у тым ліку жанчын, дзяцей і старых. У прыватнасці, 29 студзеня 1946 года тэрарысты на чале з Райсам здзейснілі нападзенне на Гайнаўку, дзе забілі дваіх савецкіх салдат, яшчэ два былі паранены. На наступны дзень у вёсцы Старыя Пухалы бандыты Бурага з асаблівай жорсткасцю (абухамі сякер) забілі звыш 30 беларускіх сялян. Затрыманы Райс быў уладамі Польшчы толькі ў лістападзе 1948 года. Польскі суд прымяніў да яго вышэйшую меру пакарання. У снежні 1949 года прыгавор быў прыведзены ў выкананне.


-5-
225
Wykolejać należy: 1) Ładunkami małemi (np. po 400gr. po kilka sprzężonemi lontem wybuchowym) (przez mało porwaną szyn pociąg przeskakuje) przed lokomotywą.

a) 1,2,3,4 – ładunki trotylu po 400gr = 1,600 gr.
b) długość wyrwy = ±2,30 mtr.
c) długość lontu wyb. = 2,30 mtr.
d) ilość spłonek = 8.

4 ładunki małe po 400gr.

(Spłonki prócz pierwszej na szynie można zastąpić węzłami z lontu wyb., potrójnie związanemi).

2) Ładunkiem dużym od 3–15 kgr. trot. pod lokomotywą należy wysadzać.

Przy ładunku skupionym 3 kgr. paczkowanym najlepiej pod styk szyn między podkładami.

Przy ładunku trotylu = 15 kgr lokomotywa nawet na prostej przewraca się na bok, tarasując tor sąsiedni.

Przy minach natychmiastowych mało widocznym jest zapalnik pociągowy z ułamywaną główką, włożony między styki szyn.

II. Uszkadzanie szlaku kolejowego.

1) Najskuteczniejszem jest wtedy, gdy szyny są zrywane masowo na przestrzeni kilkunastu kilometrów, co kilkadziesiąt metrów, naprzemian na jednym toku, to na drugim. (Wymiana szyn wówczas jest utrudniona). Z boku szyn dajemy wtedy po 400gr., lub pod szynę lub na styk 1 kg. kruszący lontem prochowym 10 cm długim.

2) Rwanie rozjazdów (najprościej lontem prochowym 10cm ...) a/ na iglicach b/ na krzyżow-

Інструкцыя Арміі Краёвай па правядзенні дыверсій.


-3-
224
VII. Mina czasowa.
Pocisk artyleryjski.
1/ trotyl, 2/ spłonka saperska.
3) 7cm. lontu prochowego, 4/ rureczka papierowa z solą Bertholeta z cukrem.
5/ łuska karabinowa z kwasem siarczanym (łuska winna w szyjce mieć ± 2 otworki)
Od chwili włożenia rureczki papierowej do kwasu do wybuchu upłynie ± 10 minut do 1 godziny (zależnie od stężenia $H_2SO_4$ i grubości papieru)

VIII. Mina czasowa wraz z butelką o działaniu natychmiastowem.
W odległości ± 1 – 2 mtr. od miny czasowej kładziemy w materjał łatwopalny ± 2 butelki o działaniu natychmiastowem. Wybuch miny strzaska butelki, powodując pożar.

IX. Termit zapalany lontem prochowym ± 10 cm. długości, zakończonym grubo na palec torebką papierową z solą Berthol. z cukrem. (Przy palenie się termitu musi być dostęp powietrza)

X. Wysadzenie jarzma drewnianego mostu.
1) lont prochowy 20cm.

***— А ці атрымалі па заслугах іншыя ўдзельнікі польскага антысавецкага падполля?***

— Дзеяннем усіх арыштаваных на тэрыторыі Заходняй Беларусі ўдзельнікаў антысавецкага падполля савецкімі судовымі органамі была дадзена юрыдычная ацэнка ў адпаведнасці з нормамі крымінальна-працэсуальных і крымінальных кодэксаў БССР або СССР. Да таго ж у перыяд актыўнай тэрарыстычнай дзейнасці антысавецкага падполля ў 1947—1951 гадах у Савецкім Саюзе было адменена смяротнае пакаранне. У 1990—2000-я гады ўсе крымінальныя справы на дадзеную катэгорыю асоб былі перагледжаны ў межах працэсу рэабілітацыі ахвяр палітычных рэпрэсій 1920—1950-х гадоў. У большасці выпадкаў аб'екты яны былі прызнаныя тымі, якіе не падлягаюць рэабілітацыі.

***— А як працэс гераізацыі антыгерояў успрымаецца польскім грамадствам?***

— У 1990-я гады, калі быў створаны польскі Інстытут нацыянальнай памяці, былі прыхільнікі таго, каб прысудзіць таму ж самаму Райсу статус нацыянальнага героя, але былі і тыя, хто выступаў супраць гэтай палітычнай рэабілітацыі. Усё залежала ад таго, хто ў Польшчы знаходзіўся каля ўлады. У 2000-я гады мы сталі больш звяртаць на гэта ўвагу, асабліва калі ў Гайнаўцы сталі праходзіць традыцыйныя маршы ў падтрымку «праклятых салдат». Мы ведаем, што гэта рэгіён, дзе пражывалі і пражываюць шматэтнічныя беларусы. Аднак у польскім грамадстве, не толькі сярод жыхароў Беласточчыны, але і сярод палітыкаў, дэпутатаў Еўрапарламента ёсць тыя, хто выступае супраць правядзення такіх маршаў. І з кожным годам праціўнікаў маршаў становіцца больш. Асобна хачу звярнуць увагу на пазіцыю Польскай праваслаўнай царквы, якая ў кастрычніку 2019 года кананізавала 30 старапухальскіх мучанікаў, якія загінулі за праваслаўную веру. Вызначаючы рэакцыю польскага грамадства, трэба адзначыць, што сёлета ўпершыню Прэзідэнт Польшчы Анджэй Дуда прыехаў у Гайнаўку і ўсклаў кветкі на магілу ахвяр тэрору «праклятых салдат», нават схіліў калена. Гэта сімвалічна. Але вельмі важна, у якой ступені гэты крок будзе мець працяг і які.

***— Ёсць пэўныя палітычныя сілы, якія зацікаўлены ў тым, каб перагледзець нашу гісторыю...***

— Сёння мы разглядаем падзеі гісторыі не з пункту гледжання савецкай камуністычнай ідэалогіі, а з пункту гледжання краіны, якая набыла незалежнасць. І беларусы, як і іншыя, маюць поўнае права даваць уласныя канцэпцыі гістарычнага развіцця сваёй краіны, дзяржаўнасці. Таму, ацэньваючы дзейнасць польскага антысавецкага падполля, мы акцэнтуем увагу не толькі на яго антысавецкім характары. Мы кажам пра тое, што яно не было прабеларускім: яно дзейнічала насуперак нашым нацыянальным інтарэсам. Ні развіццё беларускай мовы, ні культуры, ні тым больш дзяржаўнасці імі не прадугледжвалася. Калі б не мы атрымалі перамогу, нас чакала б вяртанне ў лепшым выпадку ў тыя ўмовы, якія існавалі пасля Рыжскага мірнага дагавора. Тое, што ў 1945 годзе Беларусь апынулася сярод краін — заснавальніц Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, яны, вядома, улічвалі, але адкрыта аб гэтым не выказваліся. Нашы тэрытарыяльныя межы былі гарантаваныя пагадненнем не толькі паміж Савецкім Саюзам, Вялікабрытаніяй і ЗША — яны былі гарантаваныя на ўзроўні ААН. Гэта вялікае дасягненне. Дзеянні савецкіх органаў бяспекі па нейтралізацыі антысавецкага падполля на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў пасляваенны час былі накіраваны ў тым ліку на стварэнне ўмоў для далейшага паспяховага развіцця беларускай нацыі і ўмацавання нацыянальна-дзяржаўнай ідэнтычнасці беларусаў у межах БССР як адной з гістарычных форм беларускай дзяржаўнасці.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота з публікацый Ігара ВАЛАХАНОВІЧА.**

# ІНДУСТРЫЯ СУСТРЭЧ

## ПЛЯЦОЎКІ — ЁСЦЬ

Як заўважыла дырэктар Дэпартамента па турызму Міністэрства спорту і турызму Рэспублікі Беларусь Ірына Варановіч, сёння MICE-турызм — адзін з актуальных кірункаў ва ўсім свеце, і замежныя партнёры ўсё часцей звяртаюцца, каб даведацца пра патэнцыял Беларусі ў арганізацыі індустрыі сустрэч. З канца 2019 года ў нашай краіне была створана міжведамасная каардынацыйная група пры Савеце Міністраў, якая разглядае пытанні развіцця розных турыстычных кірункаў, у тым ліку дзелавога.

Сёння краіна валодае шэрагам пляцовак, гатовых арганізоўваць і абслугоўваць дзелавыя сустрэчы. Атэлі сусветнага ўзроўню з заламі, дзе можна праводзіць вялікія пасяджэнні, а таксама разнаркоўваць удзельнікаў канферэнцый па асобных меншых памяшканнях для работы ў секцыях, створаны не толькі ў сталіцы, але і ў абласных цэнтрах. Улічваюцца пандэмічныя асаблівасці. Закуплена абсталяванне, якое дазваляе рабіць прамыя трансляцыі з пасяджэнняў і весці іх запіс, падключацца асобным удзельнікам да мерапрыемстваў у анлайн-фармаце.

У сталіцы мы маем шматпрофільныя культурна-спартыўныя комплексы «Чыжоўка-Арэна» і «Мінск-Арэна», якія гатовыя прымаць не толькі маштабныя спартыўныя мерапрыемствы, але і культурныя, навуковыя, адукацыйныя, выстаўкі, канферэнцыі, форумы, карпаратывы. Іх базы могуць трансфармавацца пад любыя запыты, супрацоўнікі гатовыя да комплекснага абслугоўвання сваіх гасцей. Дарэчы, гэта адны з самых сучасных на дадзены момант пляцовак у Еўропе.

## ІМІДЖ — НАПРАЦАВАНЫ

Намеснік дырэктара па турыстычнай дзейнасці РУП «Цэнтркурорт» Аляксей Стрэльчанка заўважыў, што гісторыю развіцця дзелавога турызму сёння варта падзяляць на два перыяды. У першы, дапандэмічны, закладзена база для прасоўвання Беларусі. Штогод колькасць міжнародных мерапрыемстваў, якія праводзіліся на тэрыторыі нашай краіны, прырастала.

Можна згадаць пра сусветны кангрэс славістаў, альбо правядзенне чэмпіянату свету па хакеі. Менавіта гэта спартыўнае мерапрыемства стала рэвалюцыйнай вяхой у развіцці турызму як паўнацэннай галіны эканомікі Беларусі. Была створана і забяспечана адпаведнай інфраструктурай і сэрвісам пляцоўка для таго, каб прымаць вялікую колькасць гасцей. Тады тысячы замежнікаў адкрылі для сябе нашу краіну. У свеце з'явілася новая турыстычная дэстынацыя. Штогод ішло нарастанне дзелавой актыўнасці па розных галінах. Сусветны з'езд эколагаў, міжнародны кангрэс анколагаў, пасяджэнне сусветнай электратэхнічнай камісіі, сусветны кангрэс удзельнікаў касмічных палётаў, Другія еўрапейскія гульні... Гэтыя і многія іншыя міжнародныя мерапрыемствы ўплывалі на фарміраванне іміджу Беларусі.

Шмат намаганняў прыкладалася, каб завабіць на нашу тэрыторыю гасцей з Кітая. За апошнія гады Кітай стаў краінай нумар адзін па імпарце сваіх турыстычных магчымасцяў, прычым да пандэміі назіраўся штогадовы прырост турыстаў. Так, у 2019 годзе па свеце раз'язджала звыш 120 мільёнаў падарожнікаў з Паднябеснай, і немалую долю тут займалі дзелавыя турысты. У Кітаі існуе дзяржаўнае рэгуляванне і заахвочванне буйных кампаній, якія праводзяць дзелавыя мерапрыемствы за мяжой. Гэта лічыцца прапагандай кітайскай навукова-тэхнічнай думкі, дасягненняў.

У 2019 годзе Беларусь паспела арганізаваць самую буйную ў гісторыі турызму нашай краіны дзелавую сустрэчу. Адна з найбуйнейшых кітайскіх кампаній абрала нашу краіну, як пляцоўку для свайго карпаратыўнага мерапрыемства, якое доўжылася на працягу двух тыдняў. Было абслужана дзве з паловай тысячы турыстаў. Да гэтага ніколі адначасова такую групу гасцей Беларусь яшчэ не прымала, было задзейнічана 58 аўтобусаў розных кампаній 12 рэстаранаў.

## ПЛАНЫ — ЗАСТАЛІСЯ

Як прызнаўся Аляксей Стрэльчанка, ад планаў, якія да пандэміі ставілі нашы туркампаніі на 2020 год, перахоплівала дух. Але ўсё перарваў каранавірус. І, тым не менш, менавіта на дзелавы турызм, на яго думку, варта рабіць стаўку. Яго магчымасці больш высокія, чым іншых сегментаў турэканомікі. Так, апошнія сезоны паказалі, што пры закрытых межах актыўна пачаў развівацца ўнутраны турызм. Людзі шукаюць і знаходзяць для адпачынку замену традыцыйным маршрутам. А дзелавым падарожжам пакуль альтэрнатывы няма. Для развіцця эканомікі неабходны абмен думкамі, навукова-тэхнічнымі дасягненнямі, напрацоўкамі. У анлайн-рэжыме паўнавартасна гэта рабіць пакуль не атрымліваецца. Для MICE-аператараў прыезд гасцей — магчымасць атрымаць даходы і даць зарабіць іншым кампаніям, якія гатовы забяспечваць транспартнае суправаджэнне, харчаванне, арганізацыю забаўляльных мерапрыемстваў.

Адзін з неабходных крокаў для развіцця дзелавога турызму — стварэнне Нацыянальнага кангрэснага бюро. Плануецца, што ў наступным годзе такая структура выйдзе на інфармацыйнае поле. Яна павінна стаць «адным акном» для заказчыкаў з усяго свету, якім патрэбны звесткі пра турыстычны патэнцыял краіны, пляцоўкі для дзелавога турызму. Нават у неспрыяльных эпідэміялагічных умовах працягваецца работа над турпрадуктамі. Нашы цэнавыя прапановы на паслугі размяшчэння больш прывабныя, чым у традыцыйных краінах для MICE-турызму, бязвіз пасля прыбыцця ў Мінск і абласныя цэнтры, стварэнне ў рэгіёнах сучасных гатэляў і комплексаў павінны спрыяць развіццю галіны, калі эпідэмія саступіць. Важна ўлічваць, што ў бізнес уцягваецца ўсё больш моладзі, якая гатова наладжваць кантакты па ўсім свеце. Але праз яе занятасць і кароткія адпачынкі ў такога кантынгенту пазнанне іншых краін пачынацца якраз можа з дзелавых паездак. Трэба праличваць, якія паслугі можна дадаткова прапаноўваць дзелавым гасцям і як ім падаваць інфармацыю аб магчымасцях для больш працяглага адпачынку ў Беларусі ў далейшым.

На думку Аляксея Стрэльчанкі, неабходна развіваць дзяржаўна-прыватнае партнёрства, калі дзяржава частку сваіх функцый у той ці іншай галіне можа перадаваць грамадскім інстытутам і тым самым зніжаць выдаткі і ствараць умовы для творчага развіцця бізнесу. Менавіта па такім шляху развіваецца кангрэс-бюро ў Расіі. Там гэта грамадская арганізацыя-асацыяцыя, якая аб'ядноўвае прадстаўнікоў розных відаў дзейнасці. Асобныя структуры адказваюць за маркетынг тэрыторый, менеджмент прадпрыемстваў, сэрвіс і паслугі. А разам яны ствараюць якасныя і разнастайныя прапановы для турыстаў. Беларусь ужо мае вопыт кластарных аб'яднанняў, якія прапаноўваюць пэўны спектр паслуг на невялікіх тэрыторыях, і гэты вопыт варта пашыраць.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

На слыху

# ЯШЧЭ АДНА ПАГРОЗА

## ШТО ВЯДОМА ПРА НОВЫ ШТАМ «АМІКРОН»

**Сусветная арганізацыя аховы здароўя (СААЗ) прызнала пагрозай для свету новы штам каранавіруса — B.1.1.529, або «Амікрон». Яго знайшлі ў краінах Паўднёвай Афрыкі, у прыватнасці ў ПАР і Батсване. Першыя паведамленні аб заражэнні новым штамам у ПАР, Батсване і Ганконгу з'явіліся 24 лістапада. Пазней выпадкі захворвання пацвердзіліся ў Ізраілі і Бельгіі.**

### ДЗЕ ЗНОЙДЗЕНЫ

Упершыню штам B.1.1.529 быў унесены ў базы даных 11 лістапада. Першы выпадак заражэння новым штамам быў зарэгістраваны ў Батсване, услед за гэтым яшчэ некалькі было выяўлена ў ПАР.

Пазней ён быў зафіксаваны таксама ў Ізраілі, Вялікабрытаніі, Нідэрландах, Ганконгу і Бельгіі. Улады Чэхіі і Германіі таксама паведамляюць, што, магчыма, іх грамадзяне, якія прыбылі з Егіпта і ПАР, заражаны новым штамам.

### У ЧЫМ АСАБЛІВАСЦІ

Па словах навуковага супрацоўніка Імперскага каледжа Лондана Тома Пікока, у шыпападобным бялку штама B.1.1.529 выяўлена больш за 30 мутацый, і адразу некалькі з іх абцяжарвае выяўленне патагена антыцеламі. Гэта значыць, вірус здольны абыходзіць нашу імунную абарону.

Як мяркуе дырэктар Інстытута генетыкі Універсітэцкага каледжа Лондана прафесар Франсуа Балло, новы штам мог утварыцца ў арганізме чалавека з аслабленай імуннай сістэмай (як мяркуецца, хворага на ВІЧ/СНІД, які не атрымліваў належнага лячэння). Хранічны ход інфекцыі, з якой не мог справіцца імунітэт, дазволіў вірусу ў арганізме хворага за доўгі час назапасіць адразу вялікую колькасць мутацый.

Згодна з данымі пачатковых даследаванняў, праведзеных у ПАР, устаноўлена, што новы штам валодае 50 мутацыямі. З іх 34 знаходзяцца ў бялковых злучэннях шыпоў, з дапамогай якіх каранавірус пранікае ў клеткі чалавека. На думку дырэктара цэнтра па барацьбе з эпідэміямі ПАР вірусолага Тулія дэ Алівейры, «размова фактычна ідзе аб эвалюцыйным скачку каранавіруса». «Ён валодае цэлым наборам мутацый, якія мы не чакалі», — заявіў спецыяліст.

Адразу некалькі змен у шыпападобным бялку патэнцыйна здольныя абцяжарыць нейтралізацыю патагена антыцеламі, што можа адбіцца на эфектыўнасці вакцын. Акрамя таго, паводле папярэдніх сведчанняў, штам вызначаецца павышанай здольнасцю да распаўсюджвання.

### ЦЯЖЭЙШАЕ ЗАХВОРВАННЕ?

Цяжар захворвання — пакуль пытанне адкрытае. На дадзены момант няма адназначных сведчанняў аб тым, што «Амікрон» здольны выклікаць цяжэйшае захворванне ў параўнанні з іншымі штамамі. У ПАР павялічваецца колькасць шпіталізацый, але мяркуецца, што гэта звязана з агульным ростам колькасці хворых, а не з COVID, выкліканым варыянтам «Амікрон». Для разумення тэндэнцыі спатрэбіцца яшчэ некалькі тыдняў. Пакуль многія пацыенты, наадварот, хварэюць у больш лёгкіх формах.

### «АМІКРОН» РАСПАЎСЮДЖВАЕЦЦА ХУТЧЭЙ

У СААЗ выказалі здагадку, што новы штам каранавіруса распаўсюджваецца хутчэй, чым яго папярэднікі. Аб гэтым сведчыць досвед ПАР. Спецыялісты асцерагаюцца, што вірус можа закрануць большую колькасць людзей у свеце, у тым ліку тых, хто перахварэў на іншыя штамы. СААЗ заклікала ўсе краіны аддаць вывучэнню новага варыянта каранавіруса большую ўвагу.

### СІМПТОМЫ

Хвароба, як правіла, пачынаецца з надзвычайнай стомленасці, боляў у мышцах і суставах, галаўнога болю. Таксама апісваюцца такі сімптом, як раздражненне ў горле (мы прывыклі казаць «дзярэ ў горле»). Звыклых сімптомаў накшталт сухога кашлю, страты нюху і смаку пакуль не адзначалася.

### ПЛР-ТЭСТЫ МОГУЦЬ ВЫЗНАЧЫЦЬ НОВЫ ШТАМ

Цяперашнія метады ПЛР-тэсціравання дазваляюць выявіць новы штам каранавіруса. «Наяўныя тэсты ПЛР па-ранейшаму здольныя выявіць гэты варыянт SARS-CoV-2», — паведаміла СААЗ. Пры гэтым адзначаецца, што ў некалькіх лабараторыях «адзін з ПЛР-тэстаў, якія шырока выкарыстоўваюцца», не змог выявіць «адзін з трох мэтавых генаў». Такім чынам, гэты ПЛР-тэст «можа прымяняцца як маркер» прысутнасці амікрон-варыянта.




### ВАКЦЫНЫ МОГУЦЬ БЫЦЬ НЕ ТАКІЯ ЭФЕКТЫЎНЫЯ

Эксперты прыйшлі да высновы, што вірус B.1.1.529 пасля цэлай серыі мутацый можа ўплываць на ўтрыманне пратэіну ў арганізме. Пры такой змене цяперашнія вакцыны могуць стаць не такія эфектыўныя, як у выпадку з папярэднімі штамамі.

### КРАІНЫ ЎВОДЗЯЦЬ ЗАБАРОНУ НА ПАЛЁТЫ Ў АФРЫКУ

У сувязі з распаўсюджваннем новага штама каранавіруса шэраг краін увёў забарону на наведванне краін Паўднёвай Афрыкі. Вялікабрытанія ўнесла ў спіс забароненых для наведвання сваімі грамадзянамі краін ПАР, Батсвану, Лесота, Эсваціні, Зімбабвэ і Намібію. Ізраіль увёў аналагічныя абмежаванні ў дачыненні да Мазамбіка, апрача шасці пералічаных краін. Расія абмяжоўвае ўезд з ПАР, Батсваны, Лесота, Намібіі, Зімбабвэ, Мазамбіка, Мадагаскара, Танзаніі, Ганконга і Эсваціні.

Чым раней, тым лепш

# ВАЖНА ВЫЯВІЦЬ І ПАЧАЦЬ ЛЯЧЫЦЬ

## Калі вірус пад кантролем, людзі з ВІЧ жывуць доўгае жыццё



**Першае снежня — Сусветны дзень барацьбы са СНІДам. І хоць падчас пандэміі каранавіруса ўся ўвага накіравана на COVID-19, распаўсюджванне не менш каварнага захворвання — ВІЧ-інфекцыі — чалавецтву пакуль не ўдалося спыніць. Аб тым, што ВІЧ нельга скінуць з рахунку, сведчыць хоць бы гіпотэза пра тое, што новы штам каранавіруса, які выяўлены ў Паўднёвай Афрыцы ў канцы лістапада і атрымаў назву «Амікрон», мог з'явіцца ў арганізме чалавека з ВІЧ. Калі імунітэт аслаблены, арганізм не можа канчаткова справіцца з вірусам і знішчыць яго. У такім выпадку вірус месяцамі можа захоўвацца ў арганізме, не забіваючы чалавека, але і не знікаючы. За гэты час ён бясконца муціруе і эвалюцыяніруе да больш дасканалых варыянтаў, якія дазваляюць хутчэй пранікаць у клеткі і пазбягаць імуннай абароны, а значыць, становяцца надзвычай заразным для чалавека. Менавіта Паўднёва-Афрыканская Рэспубліка, дзе жыве каля 7,5 мільёна чалавек з ВІЧ, і стала радзімай «Амікрона».**

Па стане на 1 лістапада 2021 года ў Беларусі зарэгістравана 32 тысячы выпадкаў ВІЧ-інфекцыі. Са статусам у краіне жыве больш за 23 тысячы чалавек. За апошнія 10 гадоў большая частка новых выпадкаў ВІЧ-інфекцыі рэгіструецца ва ўзроставай групе 35-49 гадоў.

> **«Сёння ў Беларусі гарантаванае бясплатнае лячэнне ўсіх пацыентаў, якія жывуць з ВІЧ, незалежна ад стадыі хваробы і ўзроўню імунітэту».**

— Калі раней мы казалі, што ВІЧ-інфекцыя датычыцца ў асноўным маладога пакалення — людзей да 30 гадоў, то сёння мы канстатуем тэндэнцыю яе старэння. Больш за 80 % новых выяўленых выпадкаў у нас рэгіструецца ва ўзроставых групах 30-39 гадоў і 40 гадоў і старэйшых, — кажа **загадчык аддзела прафілактыкі ВІЧ-інфекцыі і парэнтэральных вірусных гепатытаў РНПЦ гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Аляксандр АТАМАНЧУК.**

У 80 % выпадкаў інфекцыя перадаецца палавым шляхам. Ін'екцыйны шлях пры ўжыванні наркотыкаў складае каля 15 %. Але ёсць рэгіёны, дзе больш высокая колькасць ін'екцыйнага шляху перадачы, — гэта Мінск і Мінская вобласць.

— У нас нераўнамерная геаграфічнае распаўсюджанне і рэгістрацыя новых выпадкаў ВІЧ-інфекцыі. Больш за 75 % людзей з ВІЧ жыве ў трох рэгіёнах: Гомельская вобласць, Мінск і Мінская вобласць, — адзначае суразмоўнік.

У Беларусі прайсці дабравольнае медыцынскае абследаванне, у тым ліку ананімнае, можна ў любой арганізацыі аховы здароўя, дзе маецца працэдурны кабінет. Працуюць ананімныя кансультацыйныя пункты для прадстаўнікоў ключавых груп насельніцтва, якія аказваюць паслугі па кансультаванні і тэсціраванні на ВІЧ-інфекцыю. Таксама ёсць магчымасці не толькі прайсці абследаванне ва ўстанове аховы здароўя, але і свабодна купіць тэст у аптэцы і зрабіць яго дома.

Абследавацца варта як мага раней, асабліва калі ў вас ёсць падазрэнні, што вы маглі заразіцца. Як мага больш ранняе выяўленне і лячэнне дазваляюць папярэдзіць развіццё розных бактэрыяльных і вірусных інфекцый, туберкулёзу, анкалагічных хвароб.

— Сёння ні адзін са спосабаў прафілактыкі не можа спыніць распаўсюджванне ВІЧ-інфекцыі, — падкрэслівае Аляксандр Атаманчук. — Аднак ёсць навукова абгрунтаваныя і эфектыўныя спосабы папярэджання заражэння, а таксама зніжэння рызыкі інфіцыравання. Гэта выкарыстанне прэзерватываў, ужыванне антырэтравируснай тэрапіі пацыентамі з ВІЧ, бо яна не толькі падтрымлівае жыццё і здароўе такога хворага, але і вызначаецца прафілактычным эфектам. Гэта азначае, што тыя пацыенты, якія маюць добрую схільнасць да лячэння, не толькі кантралюють ход сваёй хваробы, дасягаючы невызначальнай вірусный нагрузкі, але і папярэджваюць перадачу ВІЧ сваім палавым партнёрам. Да спосабаў папярэджання адносіцца прымяненне стэрыльных іголак і шпрыцаў пры ўнутрывенных маніпуляцыях.

Спецыялісты адзначаюць, што эпідэмія COVID-19 аказала істотны ўплыў і на сітуацыю з ВІЧ-інфекцыяй. З-за ўвядзення абмежавальных мерапрыемстваў у арганізацыях аховы здароўя знізілася колькасць зваротаў па тэсціраванне. Аднак прымаюцца ўсе меры, каб мінімізаваць наступствы. У прыватнасці, прэпараты пацыентам выдаюцца на больш доўгі тэрмін, рэалізуюцца праекты па забеспячэнні пацыентаў антырэтравируснай тэрапіяй.

Пацыенты з ВІЧ хварэюць на COVID-19 з той жа частатой, што і неінфіцыраваныя людзі. Пры гэтым спецыялісты сыходзяцца на думцы, што ім паказаныя прышчэпкі супраць каранавіруса.

— ВІЧ-інфекцыя з'яўляецца хранічнай інфекцыяй, і яна, як і любое іншае хранічнае захворванне, абцяжарвае ход COVID-19 і павышае рызыку цяжкіх наступстваў і смяротных зыходаў. Таму сёння медыцынскія работнікі выступаюць за вакцынацыю пацыентаў ад каранавіруснай інфекцыі, — аргументуе Аляксандр Атаманчук.

Сёння ў Беларусі гарантаванае бясплатнае лячэнне ўсіх пацыентаў, якія жывуць з ВІЧ, незалежна ад стадыі хваробы і ўзроўню імунітэту. Яно адбываецца ў спецыялізаваных дыспансерных кабінетах і аддзяленнях, якія ёсць ва ўсіх рэгіёнах. Там пацыенты абследуюцца на ўсе інфекцыі на ўзроўні імунітэту, а пасля падбіраецца неабходная тэрапія.

— З 2018 года ў краіне дзейнічае праграма «Тэрапія для ўсіх». Гэта значыць, як толькі мы выявілі пацыента, адразу пачынаем яго лячыць, не даводзячы да цяжкіх ускладненняў. У абследаваннях і тэрапіі мы абапіраемся на рэкамендацыі СААЗ, таму мы лечым гэтак жа, як і ў іншых краінах свету. Лячэнне для пацыентаў бясплатнае, прэпараты закупляюцца ў неабходнай колькасці, і праблем з іх атрыманнем у нашых пацыентаў няма, — тлумачыць **загадчык кансультацыйна-дыспансернага аддзялення па ВІЧ-інфекцыі Гарадской інфекцыйнай клінічнай бальніцы Марына ГАРАВАЯ.**

*Поўны тэкст на сайце zviazda.by*

Лёсы людскія

# ЖЫЦЦЁ, БАГАТАЕ НА ПАДЗЕІ...

**Сын «ворага народа», перадавы токар, партыйны работнік, ліквідатар... Для адной біяграфіі, згадзіцеся, мнагавата. Але жыццё Міхаіла Рыгоравіча Рысіча арганічна ўвабрала і пераплавіла ўсе гэтыя іпастасі.**

НАРАДЗІЎСЯ Міхаіл паблізу ад Жытоміра, у сяле двароў на 50. Па нашых мерках — ладная вёска, па ўкраінскіх — амаль што хутар. Вось за два кіламетры — дык там ужо тыповае стэпавае паселішча двароў на 300, з царквой... У яе на Вялікдзень бабуля вадзіла ўнукаў.

Міхаіла — чарговага — маці нараджала ў 1941-м, у зямлянцы. Яе выкапалі для засцярогі: на мазанцы падчас абстрэлу магла загарэцца салома.

Пры акупацыі ўслед за ваеннымі ў сяло наехалі немцы-каланісты, іх пасялілі ў найлепшыя дамы, а сем'і мясцовых перакінулі ў Днепрапятроўскую вобласць. Бацька Міхаіла Рыгор Рысіч чалавекам быў пісьменным: у калгасе працаваў бухгалтарам. З дзяцінства ў яго не згіналася нага, таму на фронт не ўзялі. А нямецкі баўэр вырашыў скарыстацца вопытам мясцовага спецыяліста — паставіў «уочтыкам».

У 1946-м за гэта яго пасадзілі на восем гадоў. Бацька адбыў іх ад званка да званка. Дзеці «ворага народа» ў гэты час страшна галадалі і цяжка працавалі. Першынец, Грыша, з 13 гадоў быў афіцыйна залічаны ў штат калгаса.

...Школу Міхаіл закончыў у 1958-м. Два гады, як патрабавалася, адпрацаваў у мясцовым калгасе. Кіраваў параконкай, вазіў жанчын на жытомірскі базар, каб маглі ўтаргаваць якую капейчыну і купіць крамнага.

Жонак, нібы згаварыўшыся, браты Рысічы знайшлі па месцы службы: старэйшы асеў у Ліепаі. Туды ж, у Латвію, са сваёй Марусяй, якую сустрэў у Паставах, падаўся і Міхаіл. Уладкаваўся на завод па рамонце падводных лодак і караблёў, атрымаў найвышэйшы разрад токара-станочніка, стаў сакратаром партарганізацыі (пасада нявызваленая) красаваўся на дошцы гонару... Так было і, здавалася, будзе...

**12.4.** Резервный Победитель, которому перешло право на получение приза, уведомляется об этом не позднее 11.05.2022 по номеру телефона Участника, а также дополнительно может уведомляться о переходе права на приз посредством заказного письма с уведомлением по адресу регистрации Резервного Победителя не позднее 13.05.2022.

Резервный Победитель должен выполнить действия, перечисленные в пункте 12.2 не позднее 20.05.2022. Призы будут вручены резервным Победителям по 20.05.2022 включительно.

В случае если резервный Победитель не выполнит действия в обозначенный срок, он утрачивает право на получение приза. Призы остаются в распоряжении Организатора.

**12.5.** Выдача призов представителям Победителей осуществляется по нотариально удостоверенной доверенности.

**12.6.** Призы не подлежат замене. Выплата денежного эквивалента приза не осуществляется. Ответственность Организатора по выдаче призов ограничена количеством и видом призов, указанных в Правилах.

**12.7.** Организатор не оплачивает Участникам Рекламной игры расходы, связанные с проездом к месту оформления документов для получения призов.

**12.8.** В соответствии с главой 18 Налогового кодекса Республики Беларусь Организатор при вручении призов выступает налоговым агентом и обязан удержать сумму подоходного налога непосредственно из доходов получателя приза. При невозможности удержать исчисленную сумму подоходного налога с дохода Победителя, по причине отсутствия ему денежных выплат и (или) отказа плательщика внести причитающиеся суммы подоходного налога с Победителя, Организатор обязан направить в налоговый орган по месту жительства плательщика сообщение о сумме задолженности по подоходному налогу с Победителя.

**13. Комиссия по проведению Рекламной игры.**

**13.1.** Для контроля за соблюдением официальных Правил Рекламной игры, утверждением результатов, подведением итогов по результатам проведения Рекламной игры, рассмотрением спорных случаев, принятием решений по устным и письменным жалобам и замечаниям, возникшим при проведении Рекламной игры, Организатор создает Комиссию по проведению Рекламной игры в следующем составе:

1. Кондратенко Олег Васильевич – директор ООО «ЛВО».
2. Григорьева Юлия Игоревна – начальник управления маркетинга платежных сервисов ООО «ЛВО».
3. Верховод Александр Анатольевич – специалист по рекламе ООО «ТДИ ПРОМОИВЕНТ».
4. Атрашкевич Екатерина Владимировна – специалист по работе с клиентами ООО «ТДИ ПРОМОИВЕНТ».
5. Шорр Полина Андреевна – специалист по работе с клиентами ООО «ТДИ ПРОМОИВЕНТ».

**14. Информация о Рекламной игре, публикация Правил Рекламной игры.**

**14.1.** Правила Рекламной игры подлежат опубликованию в газете «Звязда» до начала Рекламной игры.

**14.2.** Результаты Рекламной игры будут опубликованы в газете «Звязда» в срок до 19.05.2022.

**14.3.** Имена победителей Рекламной игры будут размещены на Интернет-сайте o-plati.by.

**14.4.** Информацию о правилах и условиях участия в Рекламной игре можно получить на Интернет-сайте o-plati.by, в мобильном приложении сервиса «Оплати», а также по телефону горячей линии: +375 (29) 343 00 71 в будние дни с 10.00 до 18.00, а также с 12.00 до 14.00 в субботу.

**15. Прочие условия.**

**15.1.** Участие в Рекламной игре предполагает ознакомление и полное согласие Участников с настоящими Правилами и принятие на себя обязательства соблюдать все их условия и требования.

**15.2.** Участники Рекламной игры, претендующие на получение Призов, обязуются заполнить и подписать все необходимые документы для получения Призов.

**15.3.** Участники соглашаются давать рекламные интервью об участии в Рекламной игре, в том числе по радио, телевидению, в Интернете и в иных средствах массовой информации, а также сниматься для изготовления рекламных материалов для размещения на сайте Рекламной игры, не требуя за это какого-либо вознаграждения в рамках данной Рекламной игры. Факт участия в Рекламной игре подразумевает, что ее участники соглашаются с тем, что в рамках данной Рекламной игры их имена, фамилии, отчества, образы (изображения), аудио- и видеоинтервью и иные материалы о них могут быть использованы Организатором. Все права, в том числе исключительные права, на такие материалы будут принадлежать Организатору. Участники выражают согласие на сбор и обработку их персональных данных для целей Рекламной игры.

**15.4.** Организатор не несет ответственности за работу сети Интернет при его использовании Участником (например, плохое соединение с провайдером и т. д.) и операторов сотовой подвижной электросвязи (плохое соединение с оператором и т. д).

**15.5.** Организатор не несет ответственности за невозможность связаться с Участником в случае недостоверной информации, предоставленной Участником.

**15.6.** Споры между Организатором и Участниками Рекламной игры рассматриваются в судебном порядке согласно законодательству Республики Беларусь.

**15.7.** Все возможные претензии участников Рекламной игры в отношении организации Рекламной игры должны быть адресованы Организатору по почтовому адресу: Республика Беларусь, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, 21/5, оф. 153.

*Свидетельство № 4114 о государственной регистрации рекламной игры, зарегистрированной 25 ноября 2021 г., выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.*

Пласты гісторыі

# ДАРЫ БОГУ

## Выяўлены букеты старажытных кветак

**Археолагі знайшлі іх, узростам ад 1800 да 2000 гадоў, у разбураным мексіканскім горадзе Цеаціуакане. Пра гэта паведаміла газета The Daily Mail.**

Старажытныя артэфакты былі знойдзены на глыбіні 18 метраў пад храмам, прысвечаным Кетцалькаатлю (ён жа «Птушыны змей») — аднаму з важных багоў часоў старажытнай Мезаамерыкі, у гістарычным рэгіёне, які ўключаў у сябе цэнтральную Мексіку і паўночную Коста-Рыку. На думку спецыялістаў, расліны маглі з'яўляцца дарамі богу. Мясцовыя жыхары верылі, што гэтае бажаство падаравала чалавецтву кукурузу,



а таксама ўдзельнічала ў стварэнні людзей.

Як адзначыў археолаг Нацыянальнага інстытута антрапалогіі і гісторыі (Мексіка) Серхіа Гомес, сцёблы раслін выдатна захаваліся. Усяго спецыялісты знайшлі чатыры букеты ў добрым стане. Яны звязаныя вяроўкамі, зробленымі, верагодна, з бавоўны. Гомес назваў знаходку вельмі важнай, паколькі яна даказвае, што на гэтым месцы праводзіліся рытуалы.

Археолаг адзначыў, што цяпер яму разам з калегамі трэба будзе ўстанавіць, хто менавіта рабіў гэтыя дары.

Каманда навукоўцаў амаль 12 гадоў працуе ў Цеаціуакане. Яны прасейваюць старажытную глебу, вывучаюць скалы, піраміды і руіны палацаў, каб знайсці падказкі аб тым, хто некалі жыў у гэтым раёне. На думку спецыялістаў, горад быў пабудаваны ў 100-м годзе да нашай эры і існаваў да восьмага стагоддзя. На піку развіцця, як мяркуюць навукоўцы, яго насяляла каля 200 тысяч чалавек.

Нябачная пагроза

# ГРАДУС ПРАБЛЕМЫ

## З-за глабальнага пацяплення «абудзяцца» вірусы?

**Яно і раставанне вечнай мерзлаты могуць прывесці да «абуджэння» нечаканых вірусаў. Пра гэта заявіў лаўрэат Нобелеўскай прэміі міру Рае Квон Чунг.**



Паводле яго слоў, раставанне льдоў у тайзе і тундры Сібіры прывядзе да таго, што старажытныя хваробы і вірусы гэтага рэгіёна могуць зноў «прачнуцца».

«Нельга прадбачыць, які вірус з існых у дагістарычную эпоху ці сотні тысяч гадоў таму можа з'явіцца зноў. Яны вяртаюцца. Я ўпэўнены, што існуюць самыя розныя віды вірусаў, з якімі мы ніколі раней не сутыкаліся», — прыводзіць РІА «Навіны» словы вучонага.

Ён дадаў, што чалавецтва павінна быць гатовае да такіх выклікаў і хутка рэагаваць на іх.

Каго мы бачым!

# ГНЁЗДЫ-МАЯКІ

## Асаблівасць асінага жытла: яно... свеціцца

**Незвычайны прыклад біяфлюарэсцэнцыі сустрэўся навукоўцам-энтамолагам з Сарбоны ў трапічных лясах на поўначы В'етнама, піша N+1 са спасылкай на апублікаваны ў Journal of The Royal Society Interface артыкул.**

Гнёзды, якія свяціліся ў адказ на ўльтрафіялетавае выпраменьванне, аказаліся прыналежнымі да чатырох мясцовых відаў вос з роду Polistes, адзін з якіх пакуль неапазнаны. Паўпразрыстыя накрыўкі сотаў выпускаюць моцнае зеленавата-жоўтае свячэнне. У прыродзе такое ззянне можна заўважыць няўзброеным вокам на адлегласці 5-20 метраў.

Акрамя таго, свячэнне, аднак у гэтым выпадку ззянне, выявілася таксама ў гнёздаў яшчэ двух відаў вос, знойдзеных у Французскай Гвіяне і на поўдні Францыі.

Дарослыя асобіны вос робяць накрыўкі сваіх сот з валок-



наў шоўку і бялкоў, і менавіта нейкія з гэтых бялкоў, як лічаць навукоўцы, «адказваюць» за свячэнне.

Пры гэтым пакуль незразумела, для чаго казуркам такая біяфлюарэсцэнцыя ў гнёздах. Яны здольныя бачыць выпусканае ззянне, і навукоўцы мяркуюць, што, магчыма, накрыўкі сот служаць маякамі для асобін, якія ляцяць дадому ў вячэрнім змроку на іх ззянне.

У той жа час існуе меркаванне, што такая асаблівасць засцерагае лічынак у сотах ад небяспечнага ўздзеяння ўльтрафіялету, да якога яны ўразлівыя падчас метамарфозу, а таксама дапамагае рэгуляваць іх развіццё.

Тэхналогіі будучыні

# СУДНА БЕЗ ЭКІПАЖА

## Запусцяць першы беспілотны кантэйнеравоз

**У будучыні ўсе аперацыі па загрузцы і разгрузцы судна плануецца даверыць аўтаномным тэхналогіям. У Нарвегіі да канца 2021 года збіраюцца адправіць у першы рэйс аўтаномнае электрычнае грузавое судна Yara Birkeland. Як паведамляе CNN, на борце не будзе экіпажа, а за перамяшчэннем будуць сачыць тры берагавыя цэнтры кіравання.**

Плануецца, што Yara Birkeland здзейсніць сваё першае падарожжа паміж двума нарвежскімі гарадамі — даставіць груз з горада Херoя ў Брэвік ужо сёлета.

Судна распрацоўвала нарвежская кампанія Yara International — адзін з найбуйнейшых у свеце пастаўшчыкоў мінеральных угнаенняў. Пры яго стварэнні кампанія кіравалася ідэяй скарачэння шкодных выкідаў падчас перамяшчэння грузаў. Па даных Міжнароднай марской арганізацыі, на долю суднаходства ў цяперашні час прыпадае ад 2,5 працэнта да 3 працэнтаў сусветных выкідаў парніковых газаў.

Распрацоўка пачалася ў 2017 годзе, а першыя выпрабаванні планавалі правесці ў 2020-м. Аднак



пандэмія COVID-19 у спалучэнні з лагістычнымі праблемамі затрымала запуск.

Адзначаецца, што Yara Birkeland здольнае перавозіць 103 кантэйнеры і развіваць максімальную хуткасць у 13 вузлоў. Кантэйнеравоз будзе выкарыстоўваць акумулятар ёмістасцю 7 МВт, што «прыкладна ў тысячу разоў больш, чым у аднаго электрамабіля», па словах Ёна Слетэна, кіраўніка завода Yara ў Порсгруне.

Першапачатковая для загрузкі і разгрузкі судна спатрэбіцца людзі, аднак, як сцвярджае Слетэн, усе аперацыі ў будучыні будуць выконвацца з выкарыстаннем аўтаномных тэхналогій.

Гэта не першае ў свеце аўтаномнае судна, паколькі ў 2018 годзе ў Фінляндыі ўжо спускалі на ваду аўтаномны паром. Аднак стваральнікі называюць Yara Birkeland першым цалкам электрычным кантэйнеравозам. Пры гэтым у снежні 2019 года свой першы выпрабавальны рэйс здзейсніла кітайскае аўтаномнае электрычнае грузавое судна «Цзіньдоўюнь 0 Хао», абагнаўшы Yara Birkeland у сусветным першынстве.

**Сяргей СТАРЫНАЎ.**

**Фота з адкрытых крыніц.**

# Гараскоп стрыжак на снежань

***1 снежня, серада.*** З дапамогай нажніц можна дамагчыся ўмацавання валасоў, павелічэння іх гушчыні і шорсткасці. Тыя, у каго на галаве і так сапраўдны куст, павінны ўстрымацца ад паходу ў салон прыгажосці.

***2 снежня, чацвер.*** Сёння лепш не хадзіць да майстра, паколькі любыя маніпуляцыі з валасамі пацягнуць за сабой дэпрэсіўны стан.

***3 снежня, пятніца.*** Стрыжка прынясе хаос і блытаніну, сёння адзін з самых складаных і неспрыяльных дзён месяца.

***4 снежня, субота.*** Даволі неспрыяльны перыяд для стрыжкі, які прыводзіць да аслаблення агульнага імунітэту арганізма, што павялічвае верагоднасць узнікнення розных захворванняў. Не забудзьцеся сёння надзець шапку, каб не захварэць, а стрыжку адкладзіце.

***5 снежня, нядзеля.*** Раім не ўпусціць свой шанц для таго, каб удала выканаць стрыжку, змяніць прычоску, падлячыць валасы.

***6 снежня, панядзелак.*** Добра рабіць модныя сіметрычныя стрыжкі. Пахoд у цырульню дапаможа пазбавіцца ад матэрыяльных праблем.

***7 снежня, аўторак.*** Па гараскопе стрыжкі — дзень удалых змен, падстрыжыце хоць бы кончыкі валасоў або грыўку. Можна прымаць смелыя колеравыя рашэнні, прычоска будзе ўдалая.

***8 снежня, серада.*** Спрыяльны дзень для змены іміджу, новай прычоскі і афарбоўвання валасоў у больш светлае адценне.

***9 снежня, чацвер.*** З нажніцамі, машынкамі і плойкамі сёння можна нарвацца на шматлікія канфлікты дома і на рабоце. Менавіта пра гэта гаворыць месячны гараскоп.

***10 снежня, пятніца.*** Стрыжку адкладзіце да лепшых часоў, каб не страціць грошы, не сапсаваць сабе настрой і не пасварыцца з блізкімі.

***11 снежня, субота.*** Пафарбуйце шавялюру ў ваш любімы колер — паспяховыя справы стануць залогам шанцавання ў будучыні. Паводле гараскопа, пра нажніцы не згадваем пад знакам Рыб.

***12 снежня, нядзеля.*** Неспрыяльны дзень па месячным календары, таксама ёсць павер'е, што нядзельная стрыжка «адразае» поспех.

***13 снежня, панядзелак.*** Любыя маніпуляцыі з даўжынёй і колерам валасоў рэкамендуецца перанесці на больш удалы дзень. Інакш валасы могуць стаць непаслухмяныя, пачаць выпадаць больш за норму.

***14 снежня, аўторак.*** Работа майстра над вобразам і прычоскай дазволіць вам выглядаць захапляльна ў гэты зімовы месяц. Спрыяльны дзень для аздараўленчых і агульнаўмацавальных працэдур для валасоў.

***15 снежня, серада.*** Новая прычоска дадасць свежых сіл, дапаможа прыняць дакладнае рашэнне, унясе ў жыццё разнастайнасць і новыя ўражанні.

***16 снежня, чацвер.*** Спрыяльны для стрыжкі дзень: яна абвастрыць інтуіцыю і прыгажосць. Афарбоўка валасоў найлепшая натуральнымі фарбавальнікамі, любая іншая непажаданая.

***17 снежня, пятніца.*** Асвятляем валасы і ствараем лёгкасць



на галаве, каб прыцягнуць станоўчыя энергетычныя зарады. Калі незадаволеныя сабой і сваім настроем, тут вам абавязкова дапаможа ваш майстар.

***18 снежня, субота.*** Выдатны дзень для новай стрыжкі. Разам з адстрыжанымі валасамі зможаце ачысціць сябе ад негатыву. Валасы стануць моцныя і здаровыя.

***19 снежня, нядзеля.*** Нейтральны дзень для стрыжкі валасоў. Састрыжаныя кучары збіраюць на сябе як станоўчую, так і адмоўную энергетыку, а плюс на мінус дае нуль.

***20 снежня, панядзелак.*** Лепш адкласці візіт да цырульніка, а таксама ўсе маніпуляцыі з валасамі і пакінуць іх сёння ў спакоі.

***21 снежня, аўторак.*** Стрыжка і афарбоўка валасоў непажаданыя, могуць негатыўна паўплываць на вашу прывабнасць, настрой.

***22 снежня, серада.*** Ідэальны дзень для тых, хто хоча стаць больш актыўным, пазітыўным і жыццярадасным. Стрыжка прыцягне поспех і добрыя ўражанні, новыя сустрэчы і знаёмствы.

***23 снежня, чацвер.*** Выдатны дзень для стрыжкі, афарбоўкі валасоў, можна смела адпраўляцца ў цырульню.

***24 снежня, пятніца.*** Добры дзень для наведвання салона прыгажосці. Новая прычоска будзе ўдалая і дапаможа атрымаць аптымістычны настрой, дадасць упэўненасці ў сабе.

***25 снежня, субота.*** Прыдатны дзень для новай прычоскі. Сёння спрыяльны дзень для аздараўленчых і агульнаўмацавальных працэдур для валасоў.

***26 снежня, нядзеля.*** Калі незадаволеныя сабой, дапаможа толькі ваш майстар. На календары час кахання і дабра, стрыжомся, каб адчуць сябе на хвалі цяпла і ўзаемаразумення з блізкімі.

***27 снежня, панядзелак.*** Дзень спрыяльны для любых маніпуляцый з прычоскай. Змяняйце колер, даўжыню, рабіце новую стрыжку.

***28 снежня, аўторак.*** Новая прычоска дапаможа тым, хто жадае ўзмацніць асабістую абаяльнасць, і прынясе поспех у людзей супрацьлеглага полу.

***29 снежня, серада.*** Дзень адпачынку і асалоды. Не стрыжыце і не пераафарбоўвайце валасы.

***30 снежня, чацвер.*** Гэты перыяд для стрыжак лічыцца нейтральным. Рост валасоў можа значна прыпыніцца.

***31 снежня, пятніца.*** Дзень выдатна падыходзіць для любых працэдур, звязаных з валасамі. Падстрыгаючыся, вы абудзіце ў сабе небывалы творчы патэнцыял, зможаце рэалізаваць незвычайныя ідэі.




# ДОМ № 1

## ЯК У ЛЕГЕНДАРНЫ БУДЫНАК ЗБІРАЮЦЦА ЎДЫХНУЦЬ НОВАЕ ЖЫЦЦЁ?

**МІНСК, вуліца Чырвонаармейская, 6. З 1992 года па гэтым адрасе размяшчаецца гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Раней тут рыхтавалі будучых філолагаў. У гісторыю ўніверсітэта будынак увайшоў як «Першы дом БДУ», або «Дом № 1 БДУ», бо з яго пачынаўся ўніверсітэт. Тут працаваў і фактычна жыў на працоўным месцы першы рэктар універсітэта Уладзімір Пічэта (дарэчы, таксама гісторык-славіст), дзейнічалі бібліятэка і канцылярыя, праводзіліся заняткі на рабочым факультэце. У часы Вялікай Айчыннай вайны будынак быў моцна разбураны, а потым адноўлены на тым жа самым месцы, толькі колькасць паверхаў у ім павялічылася з двух да чатырох...**

**У пачатку лістапада бягучага года студэнты і выкладчыкі гістарычнага факультэта разам са сваімі музейнымі скарбамі пераехалі з Чырвонаармейскай на вуліцу Мендзялеева. Прыкладна ў гэты ж час у тэлеграм-канале з'явіліся «непрэзентабельныя» фота, з якіх вынікала, што ў набліжэйшай будучыні гісторыкаў будуць вучыць у невыносных умовах. У сітуацыі разбіраўся журналіст «Звязды».**

### НЕ ЗМАГЛІ Б ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ УМОВЫ

— Наша «змена прапіскі» — справа вымушаная, — тлумачыць **дэкан факультэта Аляксандр КАХАНОЎСКІ**, — таму што гістарычны будынак чакае не проста капітальны рамонт, але і мадэрнізацыя. Пытанне з часовым пераездам абмяркоўвалася больш як год. Рыхтавалася праектна-каштарысная дакументацыя, рабілася экспертыза праекта. Быў абвешчаны конкурс, вызначаны падрадчык. 2021 год — год стагоддзя БДУ, магчыма, гэта сімвалічна, што і новая старонка ў жыцці «Першага дома БДУ» пачынаецца менавіта цяпер. Упершыню думка пра будынак-музей прагучала з вуснаў нашага рэктара Андрэя Караля. Ён прапанаваў: «А чаму б з «Дома № 1», дзе зараз размяшчаецца гістарычны факультэт, не зрабіць будынак-музей?» Далей яго ідэя пачала прапрацоўвацца і ўвасабляцца ў жыццё. Прадумалі канцэпцыю, заслухалі яе на рэктараце, прэзентавалі ў Міністэрстве адукацыі і на Рэспубліканскім аргкамітэце па святкаванні стагоддзя БДУ.

Будынак на Чырвонаармейскай — гісторыка-культурны аб'ект, помнік архітэктуры (гэта акалічнасць, дарэчы, таксама павялічыла тэрмін падрыхтоўкі пакета дакументаў). Таму яго капітальны рамонт з мадэрнізацыяй будзе праводзіцца пад кантролем Міністэрства культуры, у праекта ёсць навуковы кіраўнік. Фасад захаваецца, але будзе «абноўлены», вокны заменяць на драўляныя шклопакеты з паўтарэннем «малюнка». Дах памяняюць, як і ўсе камунікацыі. Прызнаюся, мы разглядалі магчымасць не пераязджаць, але там чакаецца такі аб'ём работ, што мы не змаглі б забяспечыць умовы для вучэбнага працэсу.

### ЧАСОВЫ ПРЫТУЛАК

Той, хто хоць аднойчы ў жыцці перажыў пераезд, можа зразумець памеры катастрофы!

— А ў нас усё было выдатна арганізавана, факультэт пераехаў хутка, — з гонарам канстатуе дэкан. — Канешне, усё збіралася і ўпакоўвалася загадзя. На навучанні з выкарыстаннем інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій студэнты знаходзіліся менш за тыдзень. Вучэбны працэс ішоў згодна з раскладам. Я назіраў карціну, як выкладчык з ноўтбукам сядзіць на падаконніку і праводзіць свае заняткі.

— Выкладчыкі, работнікі і студэнты факультэта працавалі дружна і аператыўна. Праблема была яшчэ і ў тым, што мы заязджалі ў зусім пусты будынак, — заўважае **намеснік дэкана па вучэбнай і выхаваўчай рабоце Аліна ВЕРАМЕЙЧЫК**. — Да нас тут размяшчаўся Інстытут павышэння кваліфікацыі БДЭУ, які з'ехаў ужо адносна даўно, а яшчэ раней — школа для выхаванцаў дзіцячага дома-інтэрната, які быў побач. Перавозіць на новае месца нам прыйшлося абсалютна ўсё: сталы і крэслы, вучэбныя дошкі, мультыборды, інфармацыйныя стэнды... Для пераезду на факультэце па ўзгадненні з Мінгарвыканкама быў створаны студатрад у складзе 30 чалавек.

**Артур ЗІНЧАНКА, студэнт другога курса**, шчыраваў у студатрадзе з першага дня.

— Праца ў добрым калектыве спрыяе хуткаму выкананню задач. У нас была матывацыя — дапамагчы роднаму факультэту, тым больш навошта хадзіць у спартзалу, калі ёсць такая выдатная магчымасць падтрымаць сваю фізічную форму? — жартуе ён. — Мы перавозілі мэблю, тэхніку, кнігі. Асабліва запомніўся цяжкі сейф, які цягнулі адразу восем чалавек. Калі трэба было, мылі вокны і падлогу. Канешне, не буду хаваць, што заробак, які атрымалі, стаў для нас прыемным бонусам. У студатрадзе працавалі пераважна студэнты другога курса, але былі сярод нас як першакурснікі, так і студэнты трэцяга курса. Прызнаюся, што я і мае аднакурснікі вельмі спадзяёмся вярнуцца ў наш стары будынак.

Большасць студэнтаў і выкладчыкаў успрынялі пераезд факультэта як вымушаную неабходнасць. Але ў пачатку лістапада ў тэлеграм-каналах з'явіліся фота, з якіх вынікала, што ў найбліжэйшай будучыні гісторыкаў будуць вучыць проста ў невыносных умовах. Кіраўніцтва факультэта пагаджаецца, што будынак — не новы, ён быў узведзены яшчэ ў 50-х гадах мінулага стагоддзя. Там ёсць шмат паточных аўдыторый, а вось маленькіх памяшканняў, наадварот, не хапае. Затое яго плошчы дазволілі пераехаць адразу ўсяму факультэту, што можна лічыць вялікай удачай. Звычайна пустуюць толькі будынкі, дзе раней размяшчаліся вытворчыя памяшканні, што абсалютна не падыходзіць ВНУ. На момант пераезду будынак на Мендзялеева, 36 знаходзіўся яшчэ ў стадыі перадачы Беларускаму дзяржаўнаму ўніверсітэту, таму штосьці там перабудоўваць, перарабляць пад сябе гістфак не меў права. Максімум — касметычны рамонт па ўзгадненні з БДЭУ.

— Можна ва ўсім шукаць хібы і «зліваць» фатаграфіі ў сеціва, а можна ўзяць анучу ў рукі і прынесці карысць, — з горыччу канстатуе Аляксандр Каханоўскі. — Зразумела, што рукамі студэнтаў і выкладчыкаў на новым месцы зроблена вельмі шмат, ніякія тэхнічныя службы без іх дапамогі ніколі не справіліся б. Шчыравалі ўсе: і загадчыкі кафедраў, і супрацоўнікі дэканата. Вельмі дапамагло з пераездам і кіраўніцтва ўніверсітэта. Канешне, для нас усіх больш родны наш будынак на Чырвонаармейскай, мы будзем па ім сумаваць, але і тут жыць можна. Тым больш што гэта часовы прытулак...

На момант візіту журналістаў «Звязды» на чацвёртым паверсе яшчэ ішоў рамонт. Як нам патлумачылі, там будуць размяшчацца не толькі тэхнічныя памяшканні, але і некалькі вучэбных аўдыторый. І менавіта там былі зроблены «непрэзентабельныя» фота, якія распаўсюдзіліся ў тэлеграм-каналах.

У гістарычнага факультэта ніколі раней не было ўласнага стадыёна, а цяпер ён ёсць. Маецца і спартыўная зала. Магчыма, што і актавую залу таксама можна будзе задзейнічаць. Зараз вырашаецца пытанне з адкрыццём буфета.



Дэкан гістарычнага факультэта Аляксандр КАХАНОЎСКІ.

**У пачатку лістапада ў тэлеграм-каналах з'явіліся фота, з якіх вынікала, што ў хуткім часе гісторыкаў будуць вучыць проста ў невыносных умовах.**

### ЗАЗІРНЁМ У ЗАЎТРА

І ўсё ж на гістфаку жывуць днём не толькі сённяшнім, але аптымістычна зазіраюць і ў заўтрашні.

— Гэты альбом дорага каштуе, бо ў працу над праектам было ўкладзена вельмі шмат душэўных і фізічных сіл, — з гонарам кажа Аляксандр Каханоўскі, дэманструючы гасцям канцэпцыю факультэта-музея. — Ідэя заключалася ў тым, каб прадставіць ролю ўніверсітэцкай адукацыі ў гісторыі нашай краіны праз гісторыю першага нацыянальнага ўніверсітэта. Над дызайнам праекта працавала ТДА «Мастак-сэрвіс» з Полацка, але змястоўную частку будучых музейных экспазіцый прадумалі нашы супрацоўнікі.

Прызнаемся, што пабачанае моцна ўражвае. Нават не верыцца, што ўдасца ўсё задуманае ўвасобіць у жыццё.

— На першым паверсе, афармленым у стылі мадэрн, будзе размяшчацца дэканат дзённага і завочнага аддзяленняў, аўдыторыі для асоб з абмежаванымі магчымасцямі, гардэроб, сучасны буфет з барнымі стойкамі і ўтульная студэнцкая рэкрэацыя, — адзначае дэкан. — На другім паверсе — кабінет дэкана, намеснікаў, зала пасяджэння Савета факультэта (там жа будуць праходзіць і круглыя сталы), усе кафедры, вучэбныя аўдыторыі і імянная аўдыторыя Уладзіміра Пічэты. Менавіта тут распачынаецца музейная частка. Экспазіцыя, прысвечаная гадам станаўлення і развіцця ўніверсітэта, будзе размешчана ў холах і на лесвічных пралётах.

На трэцім паверсе раней была спартыўная зала з высокай столлю. Цяпер гэта памяшканне задзейнічаюць пад музей. Там размесцяцца багатая археалагічная, этнаграфічная і нумізматычная калекцыі. У дызайн-праекце будучага маштабнага музея прадугледжана эфектная падсветка. Антычныя скульптуры і экспанаты, прысвечаныя культуры Старажытнага Усходу, зоймуць холы на трэцім паверсе. Можна не сумнявацца, што пасля мадэрнізацыі гэты аб'ект стане адным з самых папулярных турыстычных маршрутаў. А чацвёрты паверх будзе прысвечаны адукацыйным інавацыям. І яго стыль — хайтэк. У холах прадставяць экспазіцыю «Сучасны ўніверсітэт». Яна не застанецца пастаяннай, а будзе змяняцца, бо і наша жыццё не стаіць на месцы.

— Калі ж казаць аб працягласці рамонту, то ёсць аптымістычны варыянт, што мы пераедзем назад, у адрамантаваны будынак, да мая 2022 года, але больш рэалістычны тэрмін — канец наступнага года, — кажа Аляксандр Каханоўскі.

**Нашы суразмоўцы заўважаюць, што ў БДУ ёсць сучасныя карпусы. Напрыклад, той жа факультэт міжнародных адносін. Але на Чырвонаармейскай панаваў асаблівы ўніверсітэцкі дух. Таму ўсе — выкладчыкі, супрацоўнікі і студэнты — спадзяюцца, што адноўлены гістфак зможа захаваць чароўную атмасферу мінулага і падарыць усім яшчэ шмат добрых эмоцый.**

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

*Поўны тэкст і больш фота на сайце zviazda.by*

Прафарыентацыя

# «#ЭЛЕМЕНТАРНА_ВАТСАН»

## Магілёўскі інстытут МУС арганізаваў анлайн-конкурс для жадаючых стаць міліцыянерамі

**Як кажуць арганізатары, конкурс па-свойму замяніў традыцыйны Дзень адчыненых дзвярэй, які штогод праводзіўся для будучых курсантаў. Сёлета анлайн-конкурс прайшоў другі раз. На працягу трох тыдняў больш за 100 навучэнцаў сярэдніх школ, гімназій, кадэцкіх вучылішчаў, сярэдніх спецыяльных і прафесіянальна-тэхнічных навучальных устаноў спаборнічала ва ўменні хутка і змястоўна рэагаваць на заданні.**

— Конкурс прайшоў на платформе сацыяльнай сеткі «УКантакце» ў спецыяльна створанай для канкурсантаў групе, — расказаў падрабязнасці **афіцыйны прадстаўнік інстытута МУС Кірыл МАРЖАНАЎ**. — Яны адказвалі на пытанні, звязаныя з гісторыяй праваахоўных органаў, дэманстравалі сваё ўменне лагічна разважаць і хутка рэагаваць, рабілі фота з людзьмі, якія іх натхняюць, і размяшчалі на платформе, здымалі відэаролікі пра сваю малую радзіму. Канкурсанты рабілі як мага больш добрых спраў, бо гэта таксама была адна з умоў конкурсу.

Актыўнасць удзельнікаў парадавала арганізатараў, і яны вырашылі заахвоціць не аднаго-трох пераможцаў, а пяцярых. У топ-5 увайшлі вучні сярэдніх школ № 3 і № 7 з горада Калінкавічы Гомельскай вобласці Уладзіслаў Кураш і Алена Малашчанка, вучаніца СШ № 2 з горада Мсціслава Магілёўскай вобласці Ганна Курцянкова, навучэнец гімназіі № 56 з Мінска Віктар Манькоўскі, а таксама навучэнка Чырвонабярэжскай школы, што ў Жлобінскім раёне на Гомельшчыне, Дар'я Сніткова.

Усе пераможцы былі запрошаны ў Магілёўскі інстытут МУС, дзе, акрамя ўрачыстага ўзнагароджання для іх была арганізавана экскурсія па ВНУ. Рабятам таксама паказалі знакавыя мясціны Магілёва.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие**
**«Минский областной центр инвестиций и приватизации»**
**(организатор аукциона)**
**по поручению антикризисного управляющего**
**ООО «Юрстайл групп»**
(220035, г. Минск, ул. Тимирязева, 67, офис 1404)
**проводит в процедуре экономической несостоятельности (банкротстве) на основании определения Экономического суда Минской области от** 30.07.2021 **по делу №** 290-17**Б**/2019

## ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН ПО ПРОДАЖЕ ОДНИМ ЛОТОМ ИМУЩЕСТВА

**ДУП «Передвижная механизированная колонна №** 185**»**
**УП «Минскоблсельстрой»**
(222410, Минская область, г. Вилейка, пос. Чапаева, 50, УНП 690018995)
**в составе**:

- **здание мастерских с бытовыми помещениями** *(составные части и принадлежности: 2 склада, трансформаторная подстанция, 2 покрытия, 2 забора, электрические сети)*, **инв. № 631/С-14025, общей площадью 872 кв. м;**
- **здание специализированное автомобильного транспорта – здание гаража на 10 автомашин, инв. № 631/С-14024, общей площадью 554,8 кв. м (далее – Объект).**

Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 621350100001000428 площадью 1,1173 га (право постоянного пользования) по адресу: Минская область, г. Вилейка, ул. Посёлок Чапаева, 50.

*Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранная зона электрических сетей напряжением свыше 1000 вольт, площадь 0,0135 га; охранная зона объектов газораспределительной системы, площадь 0,1496 га.*

Начальная цена без НДС – **444 500,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены – **44 450,00** бел. руб.). *(Начальная цена снижена 30 %.)*

Шаг аукциона – 5 (пять) процентов.

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB3012108260016 9330000 в ЦБУ № 701 ОАО «Сбер Банк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня проведения аукциона, если иной срок не будет установлен собранием (комитетом) кредиторов

**Победитель аукциона (единственный участник аукциона) в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона оплачивает вознаграждение в размере 3 (трех) процентов от цены продажи предмета аукциона и возмещает затраты на публикацию.**

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане и лица без гражданства, а также граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену приобретения лота по сравнению с предложениями других лиц.

Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 5 рабочих дней с даты проведения торгов.

Результаты торгов оглашаются публично в день проведения торгов.

В случае если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет торгов продается этому частнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Организатор аукциона вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за пять дней до даты их проведения.

Порядок проведения торгов и оформление участия в торгах определяются Законом Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)». Предыдущее извещение было опубликовано в газете «Звязда» от 12.10.2021.

Аукцион состоится **16.12.2021 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **15.12.2021** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17,**
**телефоны для осмотра: (8029) 687 59 23, (8017) 396 61 34.**

УНП 690018995

## ЗАО «БелБанкротАукцион»,

организатор торгов по продаже имущества **Бобруйское ОАО «Агромашсервис»** (УНП 700003471), объявляет о проведении 15.12.2021 г. с 9.00 до 16.00 на электронной торговой площадке bankrottorg.by электронных торгов в форме аукциона.

Предмет торгов:

### Лот 1. **Комплекс имущества Бобруйское ОАО «Агромашсервис».**

Ознакомиться с перечнем имущества, входящим в состав комплекса, можно по ссылке: https://bankrottorg.by/wp-content/uploads/2021/11/spisok-imushhestva-bobrujskoe-oao-agromashservis_torgi_15_12_21.pdf

**Размер задатка:** 10 % от начальной стоимости имущества.

**Шаг аукциона:** 5 % от начальной стоимости имущества.

Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочее время, предварительно связавшись с контактным лицом по тел. +375296083100.

Продавец: **Бобруйское ОАО «Агромашсервис»**.

**Организатор торгов:** ЗАО «БелБанкротАукцион», 220015, г. Минск, ул. Гурского, д. 22б, комн. 501; +375296083100; contact@bankrottorg.by.

Для участия в торгах необходимо уплатить задаток в размере 10 % от начальной стоимости лота не позднее 14.12.2021 г. на р/с BY16 UNBS 3012 0116 4010 0000 8933, в ЗАО «БСБ Банк», БИК UNBSBY2X, УНП 193417684, получатель – ЗАО «БелБанкротАукцион». Назначение платежа: задаток за участие в торгах по лоту № (номер лота).

Заявления на участие в торгах принимаются с 9.00 01.12.21 по 17.00 14.12.21 г. на bankrottorg.by. К заявке на участие в торгах прилагаются (для юридических лиц) и направляются в отсканированном виде по адресу: contact@bankrottorg.by следующие документы:

- свидетельство о государственной регистрации юр. лица (ИП);
- устав юридического лица;
- решение высшего органа управления юридического лица об участии в торгах, о заключении договора купли-продажи предмета электронных торгов, по итогам их проведения;
- для физических лиц: 31, 32, 33 стр. паспорта.

Организатор торгов может отказаться от проведения торгов не позднее чем за пять дней до даты проведения торгов.

Оформление участия в торгах в соответствии с регламентом ЭТП.

Победителем торгов признается лицо, предложившее наивысшую цену за предмет торгов.

Оформление результатов торгов в соответствии с регламентом ЭТП в день проведения торгов.

В случае признания торгов несостоявшимися предмет торгов может быть продан единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (претендент на покупку), при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Затраты на организацию и проведение публичных торгов в электронной форме составили: стоимость размещения объявления в газете «Звязда» согласно счет-фактуре; аукционный сбор 0,5 % от цены реализации предмета торгов; за размещение объявления о проведении торгов в базе данных ЕГРСБ 360,00 бел. руб.; 2800,00 бел. руб. за оценку.

**Срок подписания договора купли-продажи:** в течение десяти рабочих дней со дня проведения аукциона.

Победитель (претендент) обязан оплатить предмет торгов в полном объеме в сроки, установленные договором купли-продажи.

**ООО «Деловая оценка» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Строительный трест № 14» (продавец) извещает о проведении 31 декабря 2021 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2**

| |
|---|
| **ЛОТ № 1:** Изолированное помещение с инвентарным номером 350/D-152755 площадью 266,7 кв. м, назначение – Помещение общественного питания, наименование – Помещение общественного питания. Составные части и принадлежности: 2 крыльца площадью 14 кв. м |
| **Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Привокзальная, 3а |
| **Информация о земельном участке:** кадастровый номер 340100000001000446, площадь 0,1933 га; целевое назначение – для эксплуатации и обслуживания общежития |
| **Начальная цена продажи с учетом НДС: 579 600,00** бел. рублей |
| **Задаток (1 %) с учетом НДС: 5 796,00** бел. рублей |

**Продавец:** ОАО «Строительный трест № 14», г. Гомель, ул. Тельмана, 4. Контактные телефоны: +375 29 338-64-56; +375 232 34-66-02.

**Шаг аукциона – 5 %.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1**. Оплатить задаток на расчетный счет **Организатора аукциона (ООО «Деловая оценка»):**

**р/с BY60BELB30121322650030226000** в филиале ОАО «Банк БелВЭБ», г. Гомель, ул. Советская, 71, **БИК BELBBY2X, УНП 490870026.**

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов по адресу: г. Гомель, ул. Жарковского, д. 24, каб. 3-2, в рабочие дни с **10.00 до 13.00** и с **14.00 до 17.00** от даты опубликования настоящего извещения.

**Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 30.12.2021 г. в 17.00. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются.**

**Для участия в аукционе представляются:** документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юр. лицом или индивидуальным предпринимателем (далее ИП) Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юр. лица или ИП, без нотариального засвидетельствования; иностранным юр. лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юр. статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным ИП – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юр. лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или ИП Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юр. лица, иностранного физ. лица или ИП – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юр. лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенная выписка из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юр. лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

**Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за 3 (три) дня до его проведения.** В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %.** Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие в них. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается организатором в течение **5 (пяти) рабочих дней** со дня проведения торгов. Победителем торгов будет признан участник, предложивший более высокую цену. Лицо, являющееся победителем торгов, обязано: подписать протокол о результатах аукциона; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти)** календарных дней с момента подписания протокола; стоимость, сформированная в результате аукциона, должна быть выплачена продавцу в течение **30 (тридцати)** календарных дней с момента подписания договора купли-продажи. Возместить затраты на организацию и проведение аукциона и оплатить вознаграждение в размере 2 % от цены продажи предмета аукциона организатору торгов в течение **5 (пяти) рабочих дней** с момента подписания протокола. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет окончательной стоимости объекта. Проводится аукцион в соответствии с Положением Общества с ограниченной ответственностью «Деловая оценка» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части).

**Дополнительная информация по контактным телефонам организатора аукциона: +375 (232) 34-62-36, +375 (44) 750-40-03, +375 (29) 303-30-62 и на сайте www.deloocenka.by**

## ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении **13 декабря 2021 года** повторных аукционных торгов с условиями по продаже имущества, принадлежащего УП «Ошмянский дрожжевой завод»

| **Сведения о продаваемом имуществе** | |
|---|---|
